Пра Шагала мы ведаем мала

Рак прастаты не прысуд, калі…

Чыя армія наймацнейшая?

СТАР. 4 СТАР. 5 СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

21 ВЕРАСНЯ 2016 г. СЕРАДА № 182 (28292)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

БУДЗЕМ ГАВАРЫЦЬ ШЧЫРА

Аляксандр Лукашэнка заклікаў Расію вызначыцца з будучыняй сумесных інтэграцыйных праектаў

Такі вынік сустрэчы Прэзідэнта Беларусі з Дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Рыгорам Рапотам.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што галоўнае пытанне, якое ён хацеў абмеркаваць з Рыгорам Рапотам, — гэта інтэграцыйныя праекты і праблемы ў саюзным будаўніцтве Беларусі і Расіі. «Не хаваў і не буду ў гэтай гутарцы хаваць: занадта шмат праблем намецілася ў нас у краіне, занадта шмат крытыкі ў адрас не толькі інтэграцыі на ўзроўні дзвюх дзяржаў, але і на ўзроўні Еўразійскага эканамічнага саюза, СНД. Хоць СНД тую функцыю, якую можа выконваць, выконвае і рухаецца тымі тэмпамі, якія мы задаем. Галоўнае — гэта, вядома ж, Еўразійскі эканамічны саюз і саюз Беларусі і Расіі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што ў мінулым годзе гандлёва-эканамічныя адносіны Беларусі і Расіі былі не на лепшым узроўні. У гэтым годзе пакуль не ўдалося нагнаць упушчанае. «Гэта нікуды не варта. Мы заўсёды ганарымся тым, што вось тавараабарот знізіўся, але ў натуральным выразе мы дадалі. Гэта сведчыць аб тым, што мы пачалі пастаўляць у Расію вялікія аб'ёмы, але па цэнах напалову ніжэй. Якая даходнасць Беларусі ад гэтага? Практычна ніякай, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы целяпаемся (інакш не скажаш) і ўжо некалькі месяцаў не можам дамовіцца па цане на газ. У сувязі з гэтым Расія знізіла пастаўкі нафты ў Беларусь. Мы гэта ўспрымаем як ціск на Беларусь, але ціску я не пацярплю і беларусы таксама».

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што пры пастаўках у Расію блакуюцца некаторыя беларускія тавары, асабліва прадукты харчавання, якія закупляе Еўрасаюз. «У Расіі яны чамусьці «няякасныя». Але зразумела: калі мы пастаўляем якасны тавар і па прымальных цэнах у Расію, мы б'ём па кішэнях алігархаў ад сельскай гаспадаркі ў Расіі, — звярнуў увагу беларускі лідар. — Яны ціснуць на ўрад (там сувязі, вы ведаеце не горш за мяне, якія), а ўрад дае каманду «фас» рознага роду чыноўнікам — ад Рассельгаснагляду і гэтак далей. Яны ў нас тры прадпрыемствы адчыняюць для паставак — пяць зачыняюць, пяць адчыняюць — шэсць потым зачыняюць. Ідзе непрыхаваны ціск».

«Я чаму адкрыта пра гэта кажу? Таму што ўжо надакучыла, гэта ўжо праз край, далей так працягвацца не можа. Яшчэ кажу гэта таму, каб вы разумелі, на якім фоне мы сёння гаворым пра далейшае развіццё нашага саюзнага праекта. Тое, што я сказаў, ні ў якім разе не азначае, што мы будзем у нейкім плане згортваць інтэграцыйныя праекты, але свой удзел у гэтых праектах мы будзем аптымізаваць, — заўважыў Прэзідэнт. — Я даў такое распараджэнне ўраду і Адміністрацыі Прэзідэнта. Мы зараз вельмі ўважліва аналізуем наш удзел, перш за ўсё, у Еўразійскім эканамічным саюзе. Калі так будзе працягвацца — навошта нам там трымаць кучу чыноўнікаў? Там, па-мойму, ужо каля тысячы ў так званым урадзе ў ЕАЭС. І які вынік? Навошта плаціць грошы на ўтрыманне ў Маскве высакакласных спецыялістаў? Мы лепшых туды аддалі. Мы ім знойдзем працу тут, а тое, што там будуць прымацца рашэнні, мы з імі пагодзімся, таму што іх практычна няма. Парушаецца ўсё, пра што дамовіліся».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ставіць праблемныя пытанні не для таго, каб падняць шквал абурэнняў. «Не, ні ў якім разе. Але я яшчэ раз кажу: хаваць гэта нельга. Мы павінны дакладна вызначыцца: ці мы ідзем на паглыбленую інтэграцыю дзяржаў, ці не. І самае галоўнае: мы будзем выконваць заключаныя дагаворы і абавязацельствы або не будзем? Вось гэта галоўнае пытанне для нас, — канстатаваў беларускі лідар. — Вы добра ведаеце Беларусь, нашу сітуацыю і становішча. Вы выдатна разумееце, што мы не збіраемся бегчы напярэдсе паравоза і некага залішне тузаць — нам гэта не трэба. Мы заўсёды імкнуліся прыстасавацца да сваіх суседзяў, каб ім не перашкаджаць, але ў нас жа ёсць уласны інтарэс. Таму хацелася б пачуць ваш пункт гледжання, як вы ў Пастаянным камітэце гэта ацэньваеце, і як будзем дзейнічаць далей. І проста вас папрасіць як чалавека, адданага нашаму адзінству, больш актыўна падключыцца на ўзроўні ўрада і Прэзідэнта Расіі да адстойвання агульных інтарэсаў, каб мы хоць неяк рухаліся наперад».

Рыгор Рапота падзякаваў Прэзідэнту за магчымасць сустрэцца і шчырую размову, паведамляе прэс-служба беларускага лідара. «Усведамленне праблем — гэта вельмі важна для таго, каб глядзець, як іх вырашаць, — адзначыў ён. — Я думаю, мы прыйдзем да ўзаемаразумення адносна таго, як далей дзейнічаць».

Шуміць, гудзе кірмаш сталічны…

Набіраюць абароты традыцыйныя мінскія восеньскія кірмашы. Другія выхадныя дні верасня многія вытворцы сельгаспрадукцыі кіруюць на сталіцу са сваімі садова-гароднінными здабыткамі, займаюць гандлёвыя кропкі, выкладваюць тавар, чакаюць свайго пакупніка. СТАР. 3

Жыхары Іўя, сужэнцы Анатоль і Алена РАДЗЬКО, таксама сталі ўдзельнікамі кірмашу: прывезлі на продаж са свайго агарода гарбузы-веліканы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЛІЧБА ДНЯ

35,6%

ад агульнага аб'ёму жылля, здадзенага ў студзені-жніўні, пабудавана для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці пабудавана 31,2 тыс. новых кватэр — 2 676,5 тыс. кв. м агульнай плошчы жылля. У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 712,2 тыс. кв. м жылля, або 26,6% ад агульнага ўводу па краіне.

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 14°	
Віцебск	+ 12°	
Гомель	+ 11°	
Гродна	+ 13°	
Магілёў	+ 11°	
Мінск	+ 13°	

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 21.09.2016 г.

Долар ЗША	1,9481	▼
Еўра	2,1824	▲
Рас. руб.	0,0300	■
Укр. грыўня	0,0754	▼

■ Пра гэта гаварылася на Народным сходзе

РАЗНЯВОЛІЦЬ НЕЛЬГА СТРЫМЛІВАЦЬ

Бізнес павінен стаць лакаматывам эканомікі

Падчас пятага Усебеларускага народнага сходу прынята праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2016—2020 гады. У ёй прапанавана разняволіць дзелавую ініцыятыву — праз стварэнне спрыяльных умоў і роўных магчымасцяў для ўсіх грамадзян. Бізнес павінен за пяць гадоў заняць яшчэ большую долю ў ВУП Беларусі і стаць лакаматывам эканомікі. Пра тое, наколькі лёгка ўжо цяпер пачаць сваю справу і што неабходна зрабіць для развіцця дзелавога клімату за бліжэйшыя пяць гадоў, карэспандэнту «Звязды» расказаў старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва, старшыня Мінскага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў Уладзімір КАРАГІН.

— Наколькі даступныя крэдыты і банкаўскія паслугі для прадпрымальнікаў і наколькі лёгка сёння пачаць сваю справу?

— У многіх відах бізнесу няма той ступені рэнтабельнасці праектаў, каб разлічыцца з працэнтам за крэдытныя сродкі. І гэта праблема і для бізнесу, і для банкаўскай сістэмы. Крэдытнымі рэсурсамі банкаў сёння карыстаюцца, паводле ацэнак Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва, менш за 25% суб'ектаў гаспадарання. Самы аптымальны выхад для бізнесу — гэта самафінансаванне, калі людзі пазычаюць адзін у аднаго. Недаступнасць крэдытаў значна памяншае магчымасці пачаць сваю справу. Аднак, дзякуючы дзеянням Нацыянальнага банка, стаўка рэфінансавання зніжаецца апераджальнымі тэмпамі, што робіць крэдыты больш даступнымі, але яшчэ для невялікага працэнта бізнесменаў.

Пры ўсім гэтым бізнес у нашай краіне сёння пачаць досыць лёгка. Цяжка працягваць. Варта адзначыць, што значна прасцей яго стала рэгістраваць. Іншае пытанне, што яшчэ да адкрыцця бізнесу людзі павінны больш звяртаць увагу на эканамічную адукацыю. Патэнцыйным бізнесменам я часта раю спачатку папрацаваць на кагосьці, потым з кімсьці, ну а потым на сябе. Трэба прайсці гэтыя тры этапы, каб разумна ацэньваць свае магчымасці і атрымаць поспех. СТАР. 2

■ Асоба

УСЕ ДАРОГІ ВЯДУЦЬ У... МІР

Дырэктар замкавага комплексу — пра даследчыцкія амбіцыі і навуковыя адкрыцці

Вось ужо пяць гадоў прайшло, як Мірскі замак змяніў статус: замест звання філіяла Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь стаў самастойным замкавым комплексам. Увесь гэты час установай кіруе кандыдат гістарычных навук Вольга ПАПКО. Пад яе пільным кіраўніцтвам было зладжана мноства адметных выставак, арганізавана канферэнцыя, рэалізавана выдавецкіх праектаў. Не пакідае Вольга Мікалаеўна і ўласнай даследчыцкай работы, працуе ў архівах, выступае з публікацыямі ў друку. З ёй мы гутарым пра азарт навукоўца, містыку Мірскага замка і важнасць работы ў камандзе.

— Вольга Мікалаеўна, за пяць гадоў самастойнасці замкавага комплексу «Мір» змянілася шмат. Якія самыя яркія навуковыя поспехі музея можаце вылучыць?

— Наш замкавы комплекс паступова ператвараецца ў навукова-даследчую ўстанову, хоць пакуль афіцыйна такога статусу не мае. Але паколькі ў нас няма адмыслоўцаў па ўсіх кірунках — а ў музеі захоўваецца і калекцыя зброі, і мэблі, і яўрэйская гісторыя нас цікавіць, — то пры патрэбе звяртаемся да вузкіх спецыялістаў, вядомых у нашай краіне і за мяжой навукоўцаў, а нейкія тэмы самі глыбока вывучаем. За гэтае пяцігоддзе мы надрукавалі калектыўную манаграфію, прысвечаную гісторыі роду першых уладальнікаў Мірскага замка — Ільінічаў. Нам дапамагалі супрацоўнікі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук, але мы суправаджалі праект, шукалі ілюстрацыі і цалкам прафінансавалі выданне кнігі. Сёлета наш музей выдаў кнігу польскага навукоўца Томаша Кэмпы, прысвечаную Мікалаю Крыштафу Радзівілу Сіротку. Думаецца, досыць метадычна падыходзім да справы, бо гісторыя Мірскага замка пачалася з Ільінічаў, прадоўжылася ў часы Сіроткі. Таксама займаемся вывучэннем родаў Вітгенштэйнаў і Радзівілаў. СТАР. 4

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Сарказі патрабуе ад мігрантаў асіміляцыі

Былы прэзідэнт Францыі і цяперашні кандыдат на пасаду кіраўніка дзяржавы Нікаля Сарказі запатрабаваў ад мігрантаў асіміляцца ў французскае грамадства.

«Ахвотныя стаць французамі павінны гаварыць па-французску, прытрымлівацца нашага ладу жыцця. Нам не патрэбна высокая ступень інтэграцыі прыезджых у наша грамадства, якая нічога не дае, нам патрэбна іх асіміляцыя», — заявіў Сарказі, выступаючы перад сваімі прыхільнікамі. «Я буду прэзідэнтам дзеянняў, я не прымаю 238 забітых», — паабяцаў кандыдат на пасаду кіраўніка дзяржавы, маючы на ўвазе агульную колькасць ахвяр тэрактаў у Францыі, пачынаючы са студзеня 2015 года. Ён таксама запэўніў, што будзе весці бязлітасную барацьбу з ісламскім тэрарызмам.

Фальсіфікацыя экалагічных паказчыкаў

Па дарогах Еўропы ездзяць мільёны аўтамабіляў, чые экалагічныя паказчыкі выхлапу сфальсіфікаваныя. Паводле даследавання еўрапейскай федэрацыі «Транспарт і навакольнае асяроддзе», каля 30 мільёнаў транспартных сродкаў забруджваюць навакольнае асяроддзе мацней, чым сцвярджаюць вытворцы. У адным з даследаваных выпадкаў было выяўлена пятнаццацікратнае перавышэнне лімітавай канцэнтрацыі дыаксіду азоту ў выхлапе. Дакладнасць тэстаў, якія праводзіліся для сертыфікацыі аўтамабіляў, выклікае сумненні, паказваецца ў даследаванні. Таму што акрэдытаваныя лабараторыі нельга назваць незалежнымі ад аўтаканцэрнаў.

У верасні 2015 года Амерыканскае Упраўленне па ахове навакольнага асяроддзя (EPA) апублікавала даследаванне таксічнасці дызельных аўтамабіляў Audi і Volkswagen з рухавікамі 2.0 TDI. Аказалася, што канцэнтрацыя вуглякіслага газу ў выхлапе ў 40 разоў перавышае дазволенае значэнне.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Навукоўцы рэкамендуюць сардэчнікам заводзіць катоў

Каты ствараюць тэрапеўтычны эфект, даказалі расійскія вучоныя. У Валгаградскім дзяржаўным універсітэце ўстанавілі, што каты нармалізуюць ціск і сардэчны рытм. Сакрэт у каціным буркатанні. І яго ўплыў пратэсціравалі на студэнтах.

У добраахвотнікаў вымяралі ціск, пульс, здымалі кардыяграму ў самым пачатку эксперыменту. Далей ім давалі праслухаць на працягу 10 хвілін запіс з буркатаннем ката ў дыяпазоне 100—120 Герц. Паралельна ўдзельнікам паказвалі фота жывёл. Пасля гэтага ацэнка стану добраахвотнікаў праводзілася паўторна. Паводле слоў навукоўцаў, кардыяграма мянялася літаральна на вачах, набліжаючыся да нормы. Першапачаткова ціск быў павышаным (каля 126 міліметраў ртутнага слупа ў дзяўчат і 155 міліметраў у хлопцаў). Але буркатанне дазволіла знізіць ціск (у дзяўчат да 119, а ў хлопцаў — да 152). Сардэчны рытм стабілізаваўся ва ўсіх добраахвотнікаў.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

«Газета дапамагла мне вывучыць мову»

Уладзімір ГІЛЕП, старшыня Беларускага фонду культуры:



— Да 15 гадоў я не ведаў беларускай мовы, бо не жыў у Беларусі. Бацька мой быў ваенным, і мы аб'ездзілі ўвесь свет, перш чым вярнуліся на радзіму. На той момант я ўжо вучыўся ў дзявятым класе і наведваў сярэднюю школу №1 у Слуцку. Мяне вызвалілі ад заняткаў па беларускай мове.

Наш настаўнік гісторыі аднойчы спытаў мяне:

— А ты беларус?

— Беларус, — адказаў я.

— А чаму ж ты не ходзіш на ўрокі беларускай мовы?

— Дык мяне вызвалілі.

— Не, гэта няправільна. Калі ты беларус, ты павінен ведаць сваю мову.

З таго часу (з 1954 года) я пачаў выпісваць «Звязду» і хадзіць на ўрокі беларускай мовы. Так што газета дапамагла мне далучыцца да роднай мовы, вывучыць яе. Я ўдзячны за гэта і ні разу не здрадзіў ёй ні ў якія часы на працягу ўжо больш 60 гадоў.

Цяпер яна прыходзіць да мяне на работу ў Беларускі фонд культуры, дзе я ўзначальваю і рэдагую сваё выданне — «Краязнаўчую газету». Па-ранейшаму з задавальненнем гартаю старонкі «Звязды» і яе дадаткаў. Праўда, па-чалавечы шкадую, што «Чырвоная змена» згубіла самастойнасць як газета і стала ўкладкай. Я паважаў і паважаю «Чырвонку» за яе мову і тэмы, якія яна ўздымае.

З іншага боку, як рэдактару «Краязнаўчай газеты» мне вельмі падабаецца, як цудоўна і прафесійна прадстаўлены ў «Звяздзе» краязнаўчы кірунак. Дадатак «Ігуменскі тракт» — гэта мноства цікавых матэрыялаў з гісторыі, свежых, пададзеных і выкладзеных па-новаму. За такі падыход я шчыра хвалю сваю родную «Звязду».

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

НЕ ТОЛЬКІ ВЫРАСЦІЦЬ, АЛЕ І ПРАДАЦЬ

Аграрыям неабходна прадаставіць усе ўмовы для рэалізацыі прадукцыі

Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам намесніка прэм'ер-міністра Міхаіла Русага і міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Леаніда Зайца.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што аграрыям павінны быць прадастаўлены ўсе магчымасці для таго, каб яны маглі прадаваць сваю прадукцыю, тым самым задавальняючы попыт насельніцтва. Рабіць гэта трэба без бюракратычных перашкод, арганізуючы кірмашы і базары.

Аляксандр Лукашэнка таксама даручыў узняць на больш высокі ўзровень сістэму інфармавання насельніцтва аб стане аграпрамысловага комплексу. «Людзей цікавіць галоўнае: каб на прылаўках была прадукцыя нашай вёскі па даступных цэнах, — растлумачыў Прэзідэнт. — Яны задаволены нашай прадукцыяй і іх цікавіць, ці будзем мы забяспечаны да новага ўраджаю сваімі прадуктамі харчавання, сваім адзеннем, сваімі тэхнічнымі культурамі».

Кіраўніку дзяржавы было даложана аб фінансавым стане аграпрамысловага комплексу, выніках уборачнай кампаніі і яе тэхнічным забеспячэнні. У сельскагаспадарчых арганізацыях краіны ўбрана 99,7 працэнта плошчаў. Пры сярэдняй ураджайнасці 33,4 ц/га ў першапачаткова апрыходаванай вазе намалочана больш за 7 млн т збожжавых і зернебабовых культур. Асаблівую ўвагу Прэзідэнт звярнуў на ўборку лёну і рапсу: «Апраўданняў можна знайсці шмат, але гэта дакладна, што мы апусціліся нават да ўзроўню мінулага года. То мы ў пыл пасеялі, то вільгаці не хапала».

Ураду, і ў прыватнасці Міністэрству сельскай гаспадаркі і харчавання, пара пераходзіць на навуковыя і кантрольныя функцыі ў сельскай гаспадарцы, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Да лістапада Прэзідэнт даручыў падрыхтаваць нараду, на якой плануецца дэталёва разгледзець сітуацыю ў сельскай гаспадарцы, эфект ад мер, што прымаюцца па падтрымцы гэтай сферы, паведамляе БЕЛТА.

■ Занятасць

ПЕРАВОЗКІ, ГАНДАЛЬ І ПАШЫЎ АДЗЕННЯ

Такія віды прадпрымальніцкай дзейнасці найчасцей выбіраюць беларусы

За студзень-жнівень гэтага года больш за 1,1 тысячы беспрацоўных атрымалі субсідыі на адкрыццё ўласнай справы. Траціна з тых, каму дзяржаўныя службы занятасці выдаткавалі грошы на бізнес, — жыхары малых гарадоў і сельскіх населеных пунктаў.

Асноўныя віды прадпрымальніцкай дзейнасці, якія выбіраюць беларусы, — транспартныя і цырульніцкія паслугі, будаўніцтва, пашыў адзення, рамонт аўтамабіляў, гандаль, вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі.

Памер субсідыі складае 11 бюджэтаў пражытковага мінімуму — цяпер гэта 1 930 рублёў. Калі чалавек збіраецца арганізаваць сваю справу ў малым горадзе з устойлівa высокім узроўнем беспрацоўя ці ў сельскай мясцовасці, то можа разлічваць на фінансавую падтрымку ў 2 632 рублі. У выпадку, калі прадпрымальніцкая дзейнасць звязана з укараненнем вынікаў навуковых распрацовак і даследаванняў, сума субсідыі будзе 3 500 рублёў.

Ахвотных працаваць на сябе спецыялісты службаў занятасці навучаюць таксама прававым і фінансавым асновам бізнесу.

— Мы назіраем за тымі прадпрымальнікамі, хто атрымаў субсідыю, на працягу года, — кажа **начальнік управлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН**. — Але мы не ацэньваем гаспадарчую дзейнасць, не глядзім, як эфектыўна вядзецца бізнес — нам важна, каб чалавек працаваў.

Выдаткаваныя грошы могуць патрабаваць вярнуць, калі чалавек не выкарыстаў іх па мэтавым прызначэнні (напрыклад, не закупіў абсталяванне, якое абяцаў набыць у дагаворы) ці займаўся прадпрымальніцкай дзейнасцю менш, чым шэсць месяцаў у годзе. Алег Токун заўважае, што такія выпадкі бываюць, але не носяць масавага характару.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zviazda.by*

Сяргей АЛЕЙНІК:

■ Экспарт

«Самы кароткі шлях да новых партнёраў — праз выстаўкі і кірмашы»

Сёння эканоміка Вялікабрытаніі — дзясятая па аб'ёме ВУП у свеце. Краіна ажыццяўляе каля 10% сусветнага экспарту паслуг. Менавіта ў Злучаным Каралеўстве знаходзіцца шэраг самых вялікіх транснацыянальных кампаній. Прытым гэтая краіна традыцыйна з'яўляецца адным з галоўных спажыўцоў беларускай прадукцыі. Што з айчынных тавараў карыстаецца найбольшай папулярнасцю ў жыхароў туманнага Альбіёна і чым яшчэ Беларусь можа зацікавіць замежных партнёраў? Пра гэта расказвае Пасол Беларусі Сяргей АЛЕЙНІК.

— Вялікабрытанія — адна з краін-лідараў па імпарце беларускай прадукцыі ў Еўрапейскім саюзе. Чым Беларусь прываблівае замежных пакупнікоў?

— Вялікабрытанія сапраўды ў 2015 годзе заняла другое месца ў аб'ёме беларускага экспарту і трэцяе ў тавараабароце сярод усіх краін — гандлёвых партнёраў Беларусі з Еўрасаюза. Нягледзячы на тое, што беларускі экспарт у значнай меры складаўся за кошт нафты і нафтапрадуктаў, шэраг беларускіх тавараў даволі значны. Беларусь пастаўляе ў Вялікабрытанію шырокі спектр як спажывецкіх тавараў (прадукты харчавання, тэкстыльныя вырабы, аптычныя прылады, мэбля, шыны), так і тавараў прамысловага прызначэння (трактары і дарожная тэхніка, рухавікі, трансфарматары, шкловалакно і інш.).

Гандлюем мы і прадукцыяй нашых «прамысловых гігантаў». Напрыклад, наладжаны рэгулярныя пастаўкі беларускай арматуры на аб'екты, якія будуюцца ў Вялікабрытаніі. Дзякуючы сваім высокім спажывецкім якасцям наша металапрадукцыя выкарыстана пры будаўніцтве такіх знакавых інфраструктурных аб'ектаў, як стадыён «Уэмблі», новы пяты тэрмінал аэрапорта «Хітроў», Алімпійская вёска ў Лондане і іншых сусветна вядомых архітэктурных збудаванняў.

— Адна з галоўных задач нядаўна прынятай Нацыянальнай праграмы падтрымкі і развіцця экспарту на 2016—2020 гады — дыверсіфікацыя экспарту. Згодна з ёй, траціна экспартных паставак павінна даводзіцца на рынак ЕС. Што тычыцца Вялікабрытаніі, якія гэтыя паказчыкі цяпер і за кошт чаго іх можна павялічыць?

— Летась беларускі экспарт у Вялікабрытанію дасягнуў амаль трох мільярдаў долараў, што складае трэцюю частку агульнага экспарту Беларусі ў краіны ЕС. У першай палове 2016 года аб'ём нашага экспарту ў Злучанае Каралеўства, на жаль, часова зменшыўся і склаў каля 600 мільёнаў долараў. Але ж зноў за кошт аб'ёмаў паставак нафты і нафтапрадуктаў на еўрапейскія рынкі пастаўкі па асноўных іншых накірунках захоўваюцца на папярэднім узроўні.

Мы бачым сур'ёзны патэнцыял для нарошчвання паставак беларускай металапрадукцыі, тэкстылю, прадукцыі дрэваапрацоўкі. Напрыклад, у маі гэтага года Лондан наведала дэлегацыя Беларускага металургічнага завода, падчас візіту якой дасягнуты дамоўленасці аб пашырэнні паставак прадукцыі ў Вялікабрытанію ў 2017 годзе.

Цяпер таксама працуем над маштабным праектам па абсталяванні курортнай зоны ў Карнуоле драўлянымі дамкамі з мэбляй, выраблены мі на прадпрыемстве «Гомельдрэў». Мы працягваем перамовы аб пастаўках беларускага адзення з буйнымі гандлёвымі прадпрыемствамі Брытаніі, нават са славутым «Маркс энд Спэнсар», адзін з заснавальнікаў якога, дарэчы, паходзіў з Беларусі.

— Якую долю ў структуры беларускага экспарту ў Вялікабрытанію займаюць інавацыйныя і высокатэхналагічныя тавары, паслугі?

— Доля іх даволі значная. Беларускія вадкакрышталічныя манітораў, апаратура сувязі, геадэзічныя прыборы, оптыка, вылічальныя машыны, нават гадзіннікі — цэлы шэраг іншых высокатэхналагічных і інавацыйных тавараў традыцыйна карыстаецца попытам у Вялікабрытаніі.

Што тычыцца паслуг, то на гэтым кірунку мы таксама маем пэўны поспех. Вялікабрытанія з'яўляецца трэцім па аб'ёме партнёрам беларускага Парка высокіх тэхналогій — каля 30 яго беларускіх кампаній-рэзідэнтаў распрацоўваюць ІТ-прадукты для брытанскіх кампаній. Напрыклад, беларускія фірмы ажыццяўлялі распрацоўку праграмных прадуктаў для такіх буйных кліентаў, як БіПі (Брыціш Петролеум), Брыціш Тэлекам, Баркліз, Лонданскай фондавай біржы і іншых кампаній Злучанага Каралеўства. Па выніках 2015 года экспарт у Вялікабрытанію ІТ-паслуг склаў 74,9 мільёна долараў, а іх доля ў агульным аб'ёме экспарту паслуг — 37,2%. У першым паўгоддзі 2016 года экспарт беларускіх камп'ютарных паслуг у Вялікабрытанію склаў 32,2 мільёна долараў (118,4% да адпаведнага перыяду 2015 года). Гэтыя лічбы толькі пацвярджаюць мае словы.

— Якія крокі плануе здзейсніць пасольства для далейшага развіцця беларускага экспарту?

— Перш за ўсё, мы заўсёды заклікаем нашы прадпрыемствы да больш актыўнага ўдзелу ў выстаўках і кірмашах, якія ў Брытаніі праходзяць амаль кожны дзень. Гэта, на наш погляд, самы кароткі шлях да непасрэдных партнёраў. Прывяду просты прыклад: у чэрвені гэтага года мы арганізавалі візіт дэлегацыі канцэрна «Беллегпрам» у Лондан для ўдзелу ў міжнароднай спецыялізаванай тэкстыльнай выстаўцы «Фэшн ЭсВіПі». У складзе дэлегацыі былі прадстаўлены такія беларускія прадпрыемствы, як «Світанак», «Аршанскі льнокамбінат». Падчас візіту ў Лондан дэлегацыя не толькі ўсталявала шмат новых і дзейсных кантактаў сярод прадстаўнікоў мясцовай тэкстыльнай індустрыі, але і пачала прадметную гутарку з шэрагам гандлёвых кампаній, сярод якіх, напрыклад, «Аркадыя Груп» — самы буйны рытэйлер моднай вопраткі Злучанага Каралеўства, у якога больш за 500 магазінаў у 35 краінах свету.

Па-другое, мы імкнёмся да стварэння сумесных прадпрыемстваў на тэрыторыі Беларусі, якія здолелі б, абапіраючыся на замежны, у тым ліку брытанскі, капітал і тэхналогіі, выйсці на экспарт тавараў не толькі ў Злучанае Каралеўства, але і ў іншыя краіны. У гэтым сэнсе нам вельмі дапамагае Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця. ЕБРР, дарэчы, 7 верасня гэтага года зацвердзіў новую Стратэгію для Беларусі на 2016—2019 гады, якая дазволіць пашырыць дзейнасць банка ў нашай краіне, у тым ліку за кошт садзейнічання прыватызацыі дзяржаўных экспартаарыентаваных прадпрыемстваў у мэтах іх далейшага паспяховага развіцця.

І па-трэцяе, нашай мэтай з'яўляецца далейшае развіццё беларускабрытанскага ўзаемадзеяння ў галіне высокіх тэхналогій, супрацоўніцтва паміж універсітэтамі і навуковымі ўстановамі Беларусі і Вялікабрытаніі. Гэта, безумоўна, будзе спрыяць пашырэнню нашай пазнавальнасці ў Злучаным Каралеўстве і за яго межамі, росту экспарту паслуг з Беларусі, замацаванню сувязяў паміж беларускімі і брытанскімі кампаніямі і арганізацыямі.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

РАЗНЯВОЛІЦЬ НЕЛЬГА СТРЫМЛІВАЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— У якім сектары эканомікі лепш за ўсё сёння пачынаць сваю справу?

— Практычна ў любой сферы можна адкрываць бізнес. Ніколі нельга сказаць, што тая ці іншая ніша канчаткова занятая. На рынку заўсёды адной і той жа справай могуць займацца сотні і тысячы кампаній. І заўсёды хтосьці гэта робіць лепш за астатніх — больш якасна, працуе са спажыўцом лепш, прадастаўляе лепшы сэрвіс. Важна займацца любой справай прафесійна. Але людзі, якія не ўкладваюцца ў сваю дзелавую адукацыю, не вывучаюць свой персанал і супрацоўнікаў, не змогуць быць канкурэнтаздольнымі. Варта таксама адзначыць, што заўсёды ёсць прыярытэты пэўнага рэгіёна, горада. Дапусцім, у нашай краіне ёсць прыярытэт для развіцця бізнесу ў сельскай мясцовасці, дзе залішняя працоўная сіла, ёсць плошчы, ёсць патрэба ў занятасці. Таксама існуюць прыярытэты і па галінах, напрыклад, харчовая бяспека, энергетычная бяспека — гэта адкрытыя нішы для нашай краіны. На іх можна сканцэнтраваць сваю ўвагу. Ну і, вядома, яшчэ на тым, у чым добра разбіраешся.

Што тычыцца вёскі, то там рынак заўсёды больш вузкі ў параўнанні з горадам. У нашай краіны ёсць нямала «белых плям» на бізнес-карце. Асноўныя прадпрымальнікі сканцэнтраваны ў Мінску і ў Мінскай вобласці — практычна 50%. Частка ў рэгіёнах, у асноўным у абласных цэнтрах, дзе гатовая інфраструктура і вялікая патрэба ў шырокім спектры паслуг, чаго практычна няма ў сельскай мясцовасці. Таму для вёскі ў прыярытэце застаецца развіццё аграэкатурызму, сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, калі побач з трасай — лагістычных цэнтраў. Дарэчы, дзелавая актыўнасць у сельскай мясцовасці сёння прырастае. Так, вялікія гарады канцэнтруюць у сабе і спажыўцоў, і банкі. Аднак, чым бліжэй да абласных гарадоў, тым больш і ўзровень канкурэнцыі. Таксама ёсць і шэраг дакументаў па прадастаўленні шырокага спектра ільгот для тых, хто адкрывае бізнес у сельскай мясцовасці. А гэта робіць каля 80% нашай краіны практычна свабоднай эканамічнай зонай. Льготы цалкам могуць кампенсаваць недахоп дарог, неабходнасць правесці камунікацыі, прайсці шэраг узгадненняў. Акрамя таго, калі прадпрымальнікі ў сельскай мясцовасці аб'ядноўваюцца, калектыўна ўсе гэтыя пытанні можна вырашаць значна хутчэй.

— Якую форму ўласнасці лепш за ўсё выбіраць будучым бізнесменам пры рэгістрацыі сваёй дзейнасці?

— Сёння практычна ўсе формы суб'ектаў гаспадарчай дзейнасці рэгістраваць лёгка. Я нядаўна пацікавіўся ў дзяржаўным рэгістры Міністэрства юстыцыі, колькі чалавек з моманту фарміравання арганізацыйна-прававой формы «індывідуальны прадпрымальнік» праз яе прайшлі. Высветлілася, што ўсяго 850 тысяч чалавек. А гэта азначае, што 600 тысяч спынілі сваю дзейнасць, як вядома, прадпрымальнікаў у краіне сёння прыблізна 250 тысяч. У ІП заўсёды былі вялікія рызыкі, за якія яны адказвалі сваёй маёмасцю. Калі ў таварыстве з абмежаванай адказнасцю ўдзельнікі адказваюць сваімі долямі, якія прапісаны ў адпаведных дакументах, то ў ІП у гэтым плане больш праблем.

Хачу таксама адзначыць, што колькасць ІП павінна яшчэ зменшыцца. Бо цяпер ідзе распрацоўка такога паняцця як статус самазанятасці. Маляр або рамеснік можа атрымаць патэнт і займацца сваёй дзейнасцю. Калі, напрыклад, рамеснік вырастае і бачыць, што для яго ёсць сэнс наняць групу людзей, тады можна рэгістраваць ІП ці ПУП (прыватнае ўнітарнае прадпрыемства). У краіне адбудоўваецца добрая сістэма для ўсіх удзельнікаў эканамічнай дзейнасці. Людзі, якія хочуць менш рызык, павінны выбіраць найбольш простую для сябе форму.

— У праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады было адзначана, што бізнесу бязвыплатна будзе прадастаўлены пакет базавых паслуг, якія дазволяць хутчэй адкрываць сваю справу. Ці ёсць ужо нейкія канкрэтныя змены ў лепшы бок у сувязі з гэтым?

— Над гэтым цяпер ідзе работа. Не так даўно адбылося пашыранае пасяджэнне Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, на якім абмяркоўваўся пакет са 125 дакументаў. У рабоце над імі дзелавая супольнасць будзе прымаць таксама актыўны ўдзел. Гэтыя паслугі сёння распрацоўваюцца бізнес-саюзамі, цэнтрамі падтрымкі прадпрымальніцтва, навучальнымі ўстановамі і дзяржавай. Сутнасць нашых абмеркаванняў у тым, што ўсе дзяржаўныя паслугі павінны рэалізоўвацца па прынцыпе аднаго акна і з выкарыстаннем дзяржаўных баз даных. Будаўніцтва электроннага ўрада фактычна вырашыць усе праблемы. Напрыклад, для тавараў будуць стварацца спецыяльныя ідэнтыфікацыйныя цэнтры, а гэта павінна прыбраць з рынку кантрафакт. Таксама пад кіраўніцтвам першага намесніка прэм'ер-міністра Васіля Мацюшэўскага створана адмысловая рабочая група, членам якой з'яўляюся і я. Сёння ёсць магчымасць спрасціць амаль 750 працэдур. І мы ацэньваем кожную, напрыклад, на атрыманне сертыфікатаў і ліцэнзій, з пункту гледжання тэрмінаў рэалізацыі, кошту і, вядома, здаровага сэнсу. Шмат непатрэбных працэдур ёсць у будаўніцтве, дзе залішнія патрабаванні да атрымання ліцэнзій, што наносіць пэўны ўдар па малым бізнесе. Акрамя гэтага цяпер пры Міністэрстве эканомікі працуе група па стварэнні стратэгіі прадпрымальніцтва на працяглы перыяд.

— Як вы ацэньваеце канкурэнцыю сярод малога і сярэдняга бізнесу краіны? Ці можна ў цэлым назваць канкурэнцыю паміж прадпрымальнікамі і дзяржаўным сектарам здаровай?

— Канкурэнцыя ёсць, але яна яшчэ слабая і, на жаль, не заўсёды сумленная. Я кажу і пра тую, што паміж дзяржавай і бізнесам, і паміж бізнесамі ў цэлым. Многія гады бізнес-супольнасць настойвала на стварэнні незалежнага антыманапольнага камітэта, які б адсочваў празрыстасць правілаў гульні, добрасумленную канкурэнцыю на рынку для ўсіх суб'ектаў гаспадарання. У гэтым плане нас пачулі. У Беларусі было прынята рашэнне рэарганізаваць Міністэрства гандлю ў Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю. Бізнес-супольнасць спадзяецца, што гэта дасць новы штуршок для развіцця дзелавой ініцыятывы і здаровай канкурэнцыі.

— Што яшчэ трэба прадпрыняць, каб можна было адназначна сказаць, што ў краіне спрыяльны клімат для вядзення сваёй справы?

— Пакуль што з дапамогай Нацыянальнай платформы бізнесу мы прасоўваем агульныя пытанні, якія ў многіх краінах ужо вырашаны. Калі вырашым іх і мы, то бізнес адыграе сваю ролю лакаматыва эканомікі. Ужо сёння краіна атрымлівае ў бюджэт 7,2 млрд долараў толькі ад падаткаў прадпрымальнікаў. Але мы не можам ісці за далёкі гарызонт без выканання базавых умоў. Бізнес ужо шмат чаму навучыўся. Калі раней прадпрымальнікі не маглі фармуляваць прававой мовай праблему, то цяпер гэты час прайшоў. Пытанні вырашаюцца праз дыялог, галоўнае ўсім навучыцца слухаць адзін аднаго. Хачу таксама падкрэсліць, што ў стратэгію развіцця краіны, якая была прынята на пятым Усебеларускім народным сходзе, увайшло 56 прапаноў дзелавой супольнасці. Яны былі раней сфармуляваны ў Нацыянальнай платформе бізнесу. Сёння мы спадзяёмся, што праз пяць гадоў 40% долі ВУП павінна фарміраваць малое і сярэдняе прадпрымальніцтва. Бізнесу неабходныя зразумелыя правілы гульні. У гэтым вялікія чаканні ўскладзены на заканатворчую ролю дзяржавы. І ўжо сёння дзяржава чуе бізнес лепш.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.
Kryzhevich@zviazda.by

Фота БЕЛТА.

■ Ва ўрадзе

ШУКАЦЬ ДАДАТКОВЫЯ СРОДКІ

Падчас пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў адзначыў, што з улікам неабходнасці збалансоўваць расходы рэспубліканскага бюджэту цяпер праводзіцца работа па аптымізацыі расходаў Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы на 2016 год.

«У сувязі з гэтым заказчыкам праграмы неабходна прадоўжыць работу па пошуку іншых дадатковых крыніц фінансавання на будаўніцтва аб'ектаў», — даручыў Андрэй Кабякоў. Ён таксама нагадаў, што праграма 2016 года фарміравалася ва ўмовах абмежаванасці бюджэтных расходаў, што вымусіла прыпыніць фінансаванне будаўніцтва шэрагу ўключаных у яе аб'ектаў. Разам з тым па праграме працягваюцца будаўніцтва і рэканструкцыя 99 стратэгічна важных і сацыяльна значных для краіны аб'ектаў, з якіх 36 планавалася ўвесці ў эксплуатацыю сёлета. На фінансаванне першапачаткова было прадугледжана 458,5 млн рублёў.

Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што ў цэлым праграма рэалізуецца здавальняюча — пры запланаваных да ўводу за 8 месяцаў 2016 года шасці аб'ектах уведзена дзевяць, у тым ліку тры — датэрмінова. Паводле яго слоў, за названы перыяд на будаўніцтва аб'ектаў ужо накіравана каля 250 млн рублёў. Пры гэтым па 12 уводных аб'ектах дапушчана адставанне ад графікаў будаўніцтва. Ён распарадзіўся, каб адказныя службовыя асобы неадкладна прынялі меры па ліквідацыі адставання.

«Сёння яшчэ ёсць час для выпраўлення сітуацыі. Мы павінны быць упэўнены, што даведзеныя заданні на 2016 год будуць выкананы ў поўным аб'ёме», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў.

Акрамя таго, ён адзначыў, што ўсё яшчэ ёсць выпадкі залішніх выдаткаў пры праектаванні і будаўніцтве аб'ектаў, што прыводзіць да неабгрунтаванага павелічэння кошту будаўніцтва. У сувязі з гэтым ва ўрадзе пад кіраўніцтвам намесніка прэм'ер-міністра Анатоля Калініна працуе спецыяльная камісія, якая спыняе гэтыя спробы, а таксама яшчэ на пачатковай стадыі праектавання адсочвае прымяненне ў праектах айчынных будматэрыялаў і абсталявання. Андрэй Кабякоў падкрэсліў, што ўсё яшчэ не вырашаным застаецца пытанне кансервацыі прыпыненых будаўніцтваў аб'ектаў. Для забеспячэння іх захаванасці неабходна прыняць меры па пошуку на гэтыя мэты сродкаў.

Міністр архітэктуры і будаўніцтва Анатоль ЧОРНЫ перад пасяджэннем Прэзідыума Савета Міністраў адзначыў, што сярод 36 аб'ектаў, што запланаваныя да ўводу ў 2016 годзе, ёсць 4 аб'екты, па якіх прыпынена фінансаванне.

«Іх прыйдзецца выключыць з уводу ў гэтым годзе з прычыны таго, што фінансаванне па пэўных прычынах спынена. Таму ўведзена будзе 32 аб'екты і дадаткова 2 незапланаваныя аб'екты — усяго 34», — растлумачыў Анатоль Чорны. Акрамя таго, ён адзначыў, што вялікую значнасць маюць 9 аб'ектаў жылля, якія ўвядуць сёлета для сем'яў, што выхоўваюць дзяцей-сірот.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Весткі з Кітая

СУВЯЗІ ЎМАЦОЎВАЮЦЦА

У рамках пятай міжнароднай выстаўкі «ЭКСПА «Кітай—Еўразія», якая адкрылася ў адміністрацыйным цэнтры Сіньцзян-Уйгурскага аўтаномнага раёна (СУАР, Паўночна-Заходні Кітай) горадзе Урумчы, на якой Беларусь стала галоўным ганаровым госцем, адбыўся бізнес-форум «Беларусь — вузлавая платформа Эканамічнага пояса Шаўковага шляху. Інвестыцыі і турызм».

У бізнес-форуме прыняў удзел намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Мікалай Снапкоў. У склад беларускай дэлегацыі пад яго кіраўніцтвам уваходзяць міністр эканомікі Уладзімір Зіноўскі, міністр інфармацыі Лілія Ананіч, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў КНР Кірыл Руды, прадстаўнікі кіраўніцтва Мінпрама, Мінспорту, Дзяржаўнага камітэта па навукі і тэхналогіях, Беларускай гандлёва-прамысловай палаты. Кітайскі бок прадстаўлялі кіраўнікі міністэрства камерцыі КНР, сотні прадстаўнікоў кіравання і бізнесу.

Адкрываючы бізнес-форум, старшыня народнага ўрада СУАР Шахрат Закір падкрэсліў: «Сённяшняя выстаўка стала важнай платформай кітайска-беларускага партнёрства. Беларусь для Кітая — важны партнёр і надзейны сябар. У 2015 годзе падчас візіту Старшыні КНР у Беларусь лідары дзвюх краін сфарміравалі выразны план руху наперад. Сіньцзян — самая блізкая да Беларусі правінцыя. І мы з радасцю адзначаем, што наша супрацоўніцтва развіваецца. У прыватнасці, сумесны праект па вытворчасці сельгасабсталявання».

У сваю чаргу намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Мікалай Снапкоў адзначыў, што месца правядзення форуму выбрана невыпадкова: «Сіньцзян — заходнія вароты Паднябеснай, Беларусь — заходнія вароты Еўразійскага эканамічнага саюза. У сваіх рэгіёнах мы з'яўляемся эфектыўнымі лагістычнымі вузламі. Наша краіна адной з першых адгукнулася на стварэнне Эканамічнага пояса Шаўковага шляху. Прэзентацыя нашых праектаў — гэта магчымасць выбудаваць новыя, яшчэ больш трывалыя і эфектыўныя сувязі, магчымасць выхаду на новыя рынкі. Мы і ў палітычным, і ў чалавечым плане можам гэта гарантаваць».

Падчас бізнес-форуму намеснік міністра спорту і турызму Беларусі Міхаіл Партной прэзентаваў турыстычны патэнцыял нашай краіны. Ён расказаў, што прывабліваюць ў нас кітайскіх турыстаў, паназваў прысутных з гістарычнымі аб'ектамі і музеямі, якія могуць зацікавіць гасцей з Паднябеснай.

Учора таксама адбылася сустрэча беларускай дэлегацыі з кіраўніцтвам інвестыцыйнага фонду «Кітай — Еўразія». Былі абмеркаваныя важныя кірункі двухбаковага супрацоўніцтва, а таксама дасягнута дамоўленасць аб адкрыцці Фінансавага інтытута фонду з удзелам беларускіх партнёраў.

Сяргей ШЫЧКО, *г. Урумчы, Кітай*

ЎТЫМ ЧАСАМ

Пакажам свой патэнцыял

Дэлегацыя з Магілёўскай вобласці збіраецца ў хуткім часе наведаць кітайскую правінцыю Цзяньсу. **Інэса ЛАБКОВА, галоўны спецыяліст камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама** паведаміла карэспандэнту «Звязды», што асноўная мэта візіту — развіццё супрацоўніцтва паміж Магілёўскай вобласцю і правінцыяй Цзяньсу.

— Гэта нашы даўнія партнёры, нашы сябры, — сказала яна. — Яшчэ адна мэта візіту — азнаямленне кітайскіх дзелавых колаў і кіраўніцтва правінцыі з інвестыцыйным, прамысловым, эканамічным і культурным патэнцыялам вобласці.

Плануецца, што дэлегацыю ўзначаліць старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір Даманеўскі, у склад яе таксама ўвойдуць намеснік старшыні Віктар Некрашэвіч, старшыня абласнога савета дэпутатаў Анатоль Ісачанка, мэры Бабруйска і Магілёва, прадстаўнікі дзелавых колаў.

У Магілёўскага аблвыканкама з правінцыяй Цзяньсу падпісаны мемарандум аб сяброўскім супрацоўніцтве — ён дзейнічае з 2007 года. Дзейнічае і пагадненне аб устанаўленні пабраціmскіх адносін паміж Магілёўскай вобласцю і правінцыяй Цзяньсу.

— Падпісалі мы яго 10 мая 2015 года, якраз тады, калі нашу дзяржаву наведаў Сі Цзіньпін, — прыгадала Інэса Лабкова.

Па яе словах, кітайская правінцыя Цзяньсу — вельмі развітая і перспектыўная, таму нашаму рэгіёну цікава наладжваць з ёй сувязі.

— Умовы работы з гэтай правінцыяй вельмі падабаюцца прадстаўнікам нашых дзелавых колаў, — паведаміла галоўны спецыяліст камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

■ На слыху

ХАЦЕЛІ ЗАРАБІЦЬ, А ТРАПІЛІ Ў РАБСТВА

У Брэсцкай вобласці затрыманы 33-гадовы жыхар г. Камянца, які вербаваў людзей для сельгасработ у Расійскай Федэрацыі, і яны фактычна траплялі ў рабства. Малады чалавек распаўсюджваў інфармацыю ў інтэрнэце аб магчымасці паехаць на збор ураджаю яблыкаў у Варонежскую вобласць, дзе, нібыта, абяцалі зарплату ў 300 долараў за месяц.

Акрамя таго, патэнцыйным працаўнікам палёў і садоў гаварылася пра добрыя ўмовы пражывання, кампенсацыі за праезд і харчаванне. Зламыснік размяшчаў свае аб'явы ў Камянцы, Кобрыне, іншых гарадах, дзе апошнім часам склалася асабліва напружаная сітуацыя з працаўладкаваннем і рабочымі месцамі. І хутка знаходзіў кліентаў.

Тое, што іх чакала на месцы «дыслакацыі», яны не маглі сабе ўявіць і ў кашмарным сне. Працавалі бясплатна, бытавыя ўмовы былі горшыя, чым нядбайны гаспадар стварае для скаціны, харчавацца даводзілася пратэрмінаванымі прадуктамі. Тых, хто спрабаваў уцячы, нярэдка даганялі і білі. Фактычна людзі трапілі ў рабства.

Першы сігнал адтуль паступіў на гарачую лінію брэсцкай грамадскай арганізацыі «Клуб дзелавых жанчын». Актывісткі звязаліся з міліцыяй. Як паведаміў **начальнік аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў Брэсцкага абласнога УУС Сяргей ДУЧЭНКА**, менавіта пры садзейнічанні названай грамадскай структуры ўпраўленнем па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі УУС быў спынены канал вывазу грамадзян з нашай краіны ў суседнюю з мэтай іх працоўнай эксплуатацыі.

Праўда, зламыснік паспеў завербаваць і вывезці больш за 50 чалавек. Як аказалася, вярбоўшчык мае судзімасць. Свае незаконныя дзеянні ён ажыццяўляў з памочнікам, асоба якога ўстанаўліваецца.

Дзесяць чалавек з ліку пацярпелых ужо вярнуліся дадому. Нехта з іх здолеў уцячы, іншым працадаўца заплаціў акурат на зваротны білет. Месцазнаходжанне астатніх высвятляецца.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

Государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» сообщает, что лот №1 капитальное строение с инв. №200/С-84139 по адресу: г. Витебск, ул. Медицинская, 12, **снимается с торгов, назначенных на 27.09.2016 в 12.00.** Контактный тел. (0212) 42-61-62. УНП 390477566

Шуміць, гудзе кірмаш сталічны...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Адна з найбольшых кірмашовых пляцовак была побач са спартыўным комплексам «Чыжоўка-Арэна», і гэтым разам на ёй гаспадарылі Брэсцкі аблспажыўсаюз, фермеры і аматары-аграрыі з гэтага паўднёва-заходняга рэгіёна краіны. Па-восеньску стракаты, шумны, але, галоўнае, багаты кірмаш парадаваў мінчукоў выбарам тавараў і даступнымі цэнамі. Самадзейныя артысты з палескай глыбінкі сваімі строямі, песнямі і найгрышамі надавалі падзеі святочны настрой.

Больш здымкаў глядзіце на сайце zviazda.by.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

■ Падпіска-2016

ЦЯПЛО ВОСЕНЬСКІХ СУСТРЭЧ

Восень крочыць па Беларусі, звяздоўцы таксама не спыняюць свой актыўны шпацыр. З пачатку верасня мы пабылі ў шэрагу раёнаў усіх абласцей, каб сустрэцца з чытачамі найстарэйшага выдання краіны. Зразумелі галоўнае: газету чакаюць, газету чытаюць, газеце давяраюць. І такіх людзей вельмі многа. Гэта магутны стымул для таго, каб рушыць наперад, рабіць газету яшчэ лепшай.

Сёння мы завіталі ў Лепель, а заўтра накіроўваемся адразу па трох адрасах. Зранку заедзем на Магілёўшчыну — у Чавусы. Тут 22 верасня з 8 да 11 гадзін на раённым вузле паштовай сувязі (РВПС) пройдзе Дзень падпісчыка газеты «Звязда». У гэты ж дзень пабываем і на Міншчыне — з 11 да 14 гадзін чакаем вас на Дзяржынскім і Барысаўскім РВПС. Давайце дарыць адзін аднаму цяпло восеньскіх сустрэч!

■ Сітуацыя

НОЎТБУК КУПІЛА! А ПЛАНШЭТ У ПАДАРУНАК?

Карэспандэнт «Звязды» дапамог чытачцы атрымаць планшэт у падарунак ад вядомай гандлёвай сеткі, якая актыўна рэкламавала свой «бонус»: магчымасць пры пакупцы тавару бясплатна займець яшчэ адно электроннае ўстройства.

Паколькі «канфліктная сітуацыя», як кажуць, вычарпана, не ўказваю назву гандлёвай сеткі, дзе прадаюць бытавыя прыборы. Яна актыўна рэкламуецца па тэлебачанні, у інтэрнэце, газетах, на бігбордах цэнтральных вуліц. Крамы працуюць у розных гарадах краіны.

Жыхарка Віцебска даўно хацела купіць сабе ноўтбук. Ды такі, каб і сыны маглі пагуляць на ім у папулярныя сярод дзятвы гульні. Так што планшэт, паабяцаны крамай у якасці бясплатнага бонусу, хлопчыкам быў бы патрэбны.

Жанчына з дзецьмі прыехала ў краму. Ветлівы гандляр растлумачыў, што рэкламная акцыя яшчэ не завершана, але планшэты... на жаль, скончыліся.

Па логіцы яна магла б не купляць нічога. Але прывабіла тое, што ноўтбук можна набыць, афарміўшы крэдыт банка непасрэдна ў краме... Пакупка абышлася прыкладна ў 12 мільёнаў рублёў (да дэнамінацыі). Плюс жанчына аплаціла сэрвіснае абслугоўванне на 3 гады — каля 1,9 мільёна. Такім чынам, выканала ўсе ўмовы акцыі, ведаючы, што бонусны планшэт не атрымае.

Логіку жанчын, вядома, растлумачыць цяжка. Але ж, думаю, па кансультацыю ў карпункт яна звярнулася, каб сумненняў не засталося, што яе правы як спажыўца не парушаныя. Пацікавілася: чаму ўсё ж рэкламуюць магчымасць атрымаць падарунак, а насамрэч планшэтаў мінімум? Няўжо не маглі прадугледзець, каб усім хапіла? Магчыма, такім чынам і прывабліваецца больш пакупнікоў?

У размове з прадстаўніком таварыства з дадатковай адказнасцю, якому належыць крама, высветлілася, што ўмовы рэкламнай акцыі не парушаны. Чытачка, як і іншыя, зрабіла пакупку ў перыяд з 1 па 31 ліпеня. Суразмоўца адзначыў, што ў распараджэнні аб правядзенні акцыі гаворыцца пра адпаведны «ліміт» планшэтаў.

У адказе журналісту з упраўлення гандлю і паслуг Віцебскага гарвыканкама таксама адзначаецца, што парушэнняў умоў акцыі няма.

Тым большы рэспект фірме, якая ўсё ж здзейсніла «звычайны цуд»: у якасці выключэння ў канцы жніўня планшэт жанчыне ўручылі! Задаволеная грамадзянка выказала падзяку і журналісту. Сказала, што і надалей будзе рабіць у гэтай краме пакупкі. Думаю, і фірма задаволеная.

...Калі артыкул рыхтаваўся да друку, знаёмы расказаў пра іншую рэкламную кампанію. Яго таварыш карыстаўся карткай банка, які гарантаваў пакупнікам у крамах-партнёрах пры пакупках шакаладку. Адпаведнае паведамленне прыйшло па sms. Якраз зрабіў пакупку — а шакаладку не далі... Дробязь — а чалавеку было непрыемна. Пайшоў да кіраўніцтва крамы і шакаладку ўрэшце атрымаў.

Наконт рэкламных акцый можна доўга разважаць, але з пункту гледжання спажыўца: калі нешта напісалі ў рэкламе, так яно і павінна быць! І не важна: планшэт або шакаладку павінны ўручыць.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *pukshanski@zviazda.by*

■ Ці чулі?!

АЛІМПІЙСКІ ГАНАРАР

Ігар Бокій атрымае больш за 300 тысяч долараў за сем медалёў Параалімпіяды

Спартсмен з Бабруйска стаў на сёлетніх Параалімпійскіх гульнях у Бразіліі сапраўдным героем. На яго рахунку больш за ўсё ўзнагарод у беларускай камандзе: сем медалёў, шэсць з якіх — найвышэйшай якасці. Напярэдадні стала вядома, якія прызавыя належаць плыўцу — 320 тысяч долараў, пра гэта паведамляе ТАСС са спасылкай на Міністэрства спорту і турызму краіны.

«У адпаведнасці з раней прынятым рашэннем уладальнік «золата» Параалімпійскіх гульняў атрымае 50 тысяч долараў прызавых, «серабра» — 30 тысяч, «бронзы» — 20 тысяч», — паведаміў **прэс-сакратар ведамства Уладзімір НЕСЦЯРОВІЧ.** «Ігар Бокій, які прынёс краіне шэсць залатых і адзін бронзавы медаль, выклікае асаблівы гонар і радасць», — адзначыў прэс-сакратар і дадаў, што на спартсмена разлічваюць і на Параалімпіядзе-2020 у Токіа.

Ігару яшчэ 22 гады, плывец-параалімпіец выступае сярод спартсменаў з парушэннямі зроку. Сёння ён ужо 11-разовы параалімпійскі чэмпіён, шматразовы чэмпіён свету і Еўропы, майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа. Акрамя таго, Бокій з'яўляецца ўладальнікам сямі дзеючых сусветных рэкордаў у параалімпійскім плаванні ў 50-метровым басейне ў катэгорыі S13: 50 м, 100 м і 400 м вольным стылем, 50 м і 100 м на спіне, 200 м комплекс і 100 м батэрфляем.

У цэлым, у Мінспорту адзначылі, што зборная Беларусі на сёлетніх Параалімпійскіх гульнях паказала годны вынік, увайшоўшы ў 20-ку лепшых краін у агульнакамандным заліку. Плануецца, што заўтра наша дэлегацыя вернецца з Бразіліі ў Мінск, з гэтай нагоды ўжо рыхтуецца цёплы прыём спартсменаў.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by

■ Добрая навіна

ЭНЕРГАСПАЖЫВАННЕ СКАРОЦІЦЦА ЎДВАЯ

«Звязда» паведамляла аб завяршэнні энергаэфектыўнай мадэрнізацыі ў яслях-садзе №45 г. Гродна. 23 верасня ўрачыстая цырымонія з такой жа нагоды пройдзе ў Ашмянах.

Праект «Энергаэфектыўнасць у школах» рэалізаваны пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага саюза, Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта, Гродзенскага гарвыканкама і Ашмянскага райвыканкама. Выканаўцамі выступілі Праграма развіцця ААН у Беларусі і Дэпартамент па энергаэфектыўнасці Дзяржстандарта.

Дзякуючы праекту ў яслях-садзе №6 г. Ашмяны ўкаранілі сучасныя тэхналогіі, якія скароцяць энергаспажыванне ўдвая. На даху ўстаноўлены сонечныя калектары, утылізатары цеплыні для падагрэву прыточнага паветра. Дах і сцены ўцяплілі, а вокны замянілі на двухкамерныя шклопакеты. Акрамя таго, замянілі энергаёмістае тэхналагічнае абсталяванне кухні, лямпы напальвання на энергазберагальныя, за ацяпляльнымі прыборамі ўстанавілі цеплаадбівальныя экраны.

Не менш важны і адукацыйны аспект праекта. Для педагогаў арганізавалі трэнінгі і семінары па розных аспектах энергазбярожэння, і зараз яны перадаюць гэтыя веды дзецям, прычым не толькі на занятках, але і ў гульнявой форме. Праектам распрацаваны канцэпт «Хуткай энергетычнай дапамогі», дзе з сучаснымі энергаэфектыўнымі тэхналогіямі, перавагамі выкарыстання аднаўляемых крыніц энергіі дзяцей знаёмяць відэаролікі, коміксы, кніжкі-расфарбоўкі.

Арганізатары праекта спадзяюцца, што ён стане стымулам для ажыццяўлення новых ініцыятыў па энергазбярожэнні на мясцовым узроўні па ўсёй краіне.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
prakopchik@zviazda.by

На дапамогу прыйшлі верталёты

Удзень было выяўлена ўзгаранне травы і хмызняку ў забалочанай мясцовасці каля вёскі Атвержычы на тэрыторыі Кашара-Альманскага лясніцтва Столінскага лясгаса.

Пажар ахапіў агульную плошчу каля 10 гектараў, а пад'язныя пуці да гэтых мясцін былі не вельмі зручнымі. Для ліквідацыі былі задзейнічаны дзве адзінкі тэхнікі і 20 чалавек. Таксама два верталёты Мі-8 авіяцыі МНС зрабілі 52 скідванні вады з паветра. Тым не менш ранкам учарашняга дня ліквідацыя пажару яшчэ працягвалася.

Усяго, згодна з аператыўнымі звесткамі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, за пажаранебяспечны перыяд у краіне адбыліся 2051 пажар травы і кустоўя на агульнай плошчы больш за 821,8 гектара, 152 тарфяныя і 261 лясны пажар. У Гомельскай вобласці ў лясах па-ранейшаму захоўваецца надзвычайная пажарная небяспека.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Рэпарцёр атрымаў заданне...

Уладкаваць дзіця ў беларускамоўную навучальную ўстанову

Як бацькі выбіраюць дзіцячы садок або школу? Звычайна яны кіруюцца такімі параметрамі, як блізкасць ад дома, высокія паказчыкі паспяховасці, добрыя педагогі. Аднак у краіне, у якой дзве мовы з'яўляюцца дзяржаўнымі, яшчэ трэба вырашыць, навучанню на якой з іх аддаць перавагу. Мы паспрабавалі ўладкаваць дзіця ў беларускамоўныя садок і школу ў сталіцы, пагаварылі з выпускнікамі тых самых навучальных установаў і даведаліся думку псіхолага пра білінгвістычнае асяроддзе.

У ДЗІЦЯЧЫ САДОК З ЦЯЖКАСЦЯМІ, ЗАТОЕ Ў ШКОЛУ — КАЛІ ЛАСКА

У Аксаны і Цімура двое дзяцей: 3-гадовая Анжаліка і 3-месячны Багдан. Паколькі Аксана знаходзіцца ў дэкрэтным адпачынку, дачку ў дзіцячы садок пакуль вырашылі не аддаваць. Дарэчы, у вольны час жанчына вышывае. Праз захапленне і блізкае знаёмства з роднай культурай паступова прыйшла і да беларускай мовы ў зносінах. Цімур, наадварот, размаўляе выключна па-рускі — 7 гадоў таму ён пераехаў у Беларусь з Казані. Але супраць таго, каб аддаць дачку ў беларускамоўны дзіцячы садок, нічога не мае — усё ж у выхаванні галоўная роля аводзіцца жанчыне. Анжаліка яшчэ год будзе дома з мамай і брацікам, так што спробу ўладкаваць яе ў садок можна назваць генеральнай рэпетыцыяй.

Для пачатку падрабязна вывучаем пытанне ў інтэрнэце. На форумах мамы актыўна дзеляцца гісторыямі аб тым, як дзіця не хоча хадзіць у дзіцячы садок (незалежна ад мовы навучання) і абмяркоўваюць плюсы і мінусы (пачынаючы ад прыгожага посуду і заканчваючы небяспечнымі арэлямі) розных устаноў. Што датычыць беларускай мовы навучання, то на гэтую тэму вядуцца сапраўды гарачыя спрэчкі. Класічнае «ўсё пачынаецца з сям'і» чаргуецца з абураным «хачу — аддам, няхай там навучаць». І ўсё ж такі бацькоў больш цікавяць не развагі, якія часта пераходзяць у сварку, а канкрэтная інфармацыя: у якіх садках ёсць беларускамоўныя групы. На гэтым этапе ўзнікаюць цяжкасці — афіцыйнага спіса ў інтэрнэце няма. На розных сайтах знаходзім адрывістыя, часткова ўжо састарэлыя звесткі (пільныя бацькі не забываюць адзначаць гэта ў каментарыях). З улікам заўваг, аб'яднаўшы некалькі спісаў у адзін, пачынаем падбіраць садок.

Паблізу ад здымнай кватэры Аксаны і Цімура ў мікрараёне Уручча падыходзячага не знаходзім. Разглядаем іншыя варыянты: ёсць цалкам беларускамоўны садок недалёка ад працы Цімура (зможа вазіць), але ён амаль на другім канцы горада і ў доўгатэрміновай перспектыве гэта можа стаць нязручным. Аксана жартуе (ці не?), што дзеля добрай адукацыі можна і пераехаць.

Спрабуем усё ж такі патэлефанаваць. Адказваюць нам ветліва, але па-руску. «Мы самі не вызначаем, каго браць. З гэтым пытаннем — у адміністрацыю раёна. Вы ведаеце, як цяпер складана. Баюся, што верасень — непрыдатны час для таго, каб паспяхова з гэтым разабрацца. Станавіцеся на чаргу, і, можа быць, у наступным годзе...» На ўсялякі выпадак зададзенае пытанне аб гутарцы з дзіцем на беларускай мове развесяліла суразмоўцу: «Гэта ж дзеці! Навошта? Яны хутка ўсяму навучацца!»

Званкі ў дзіцячыя садкі, у якіх ёсць асобныя групы з беларускай мовай навучання, таксама не даюць выніку — усе пытанні праз адміністрацыю раёна. Звяртаемся туды. І вось тут нас чакае неспадзяванка: чарга агульная, у які садок падыдзе — у той і адправяць. Можа пашанцаваць, і ў ім будуць беларускамоўныя групы (у Першамайскім раёне цалкам беларускамоўных садкоў зараз няма), але верагоднасць не такая вялікая. Садкі ў іншых раёнах, напрыклад, як мы хацелі, побач з месцам працы бацькоў, разглядаць не мае сэнсу — усё вызначаецца строга месцам рэгістрацыі. Парадавала толькі тое, што вольныя месцы на гэты момант у садках яшчэ ёсць.

Такі вынік Аксану насцярожыў, таму сур'ёзна заняцца пошукам адпаведнага жаданням дзіцячага садка на наступны год яна збіраецца ў найбліжэйшы час.

Вырашаем ісці далей і ўявіць, што Анжаліку пара аддаваць не ў садок, а ўжо ў школу. Зноў бяромся за тэлефон: тут сітуацыя складаецца, на шчасце, прасцей. Многія беларускамоўныя агульнаадукацыйныя навучальныя ўстановы носяць статус гімназій, таму, як мы высветлілі падчас нашага імправізаванага абзвону, некаторыя з іх не прывязаны да рэгістрацыі. Гэта значыць, што пры жаданні вас з уруцкай рэгістрацыяй без праблем залічаць у гімназію ў Серабранцы. Аднак у найбліжэйшую да іх цяперашняй кватэры гімназію Анжаліцы давялося б дабірацца больш за 40 хвілін.

Прааналізаваўшы атрыманую з афіцыйных крыніц інфармацыю, Аксана свайго рашэння не мяняе — дачка будзе навучацца на беларускай мове. Але, каб лепш зразумець спецыфіку такога навучання, вырашаем пагутарыць з тымі, хто пра гэта ведае не па чутках, — выпускнікамі беларускамоўных навучальных установ.

«СВАЙМУ СЫНУ НАНАЧ Я СПЯВАЮ БЕЛАРУСКІЯ КАЛЫХАНКІ»

Знаходзім жадаючых расказаць пра ўласны досвед у сацыяльных сетках. Дар'я Канцадайла скончыла школу 10 гадоў таму, але той час і сёння ўзгадвае з цеплынёй. У сталічнай школе №89 яна вучылася ў класе з паглыбленым вывучэннем прадметаў этнакультурнага цыкла.

— Акрамя асноўнай школьнай праграмы, якая цалкам выкладалася на беларускай мове, у нас былі такія прадметы, як фальклорны тэатр, фальклорны танец, мастацтва вуснай прамовы, выяўленчае мастацтва, спевы... Усё гэта выкладалася на аснове традыцый, вераванняў, абрадаў нашых продкаў. Патлумачу на рэальных прыкладах. Калі гэта выяўленчае мастацтва, то вялізны радавод у тэхніцы вышыўкі ці выцінанкі; калі песні, то народныя, без апрацоўкі, запісаныя ад бабуль самімі выкладчыкамі.

Наш клас з этнакультурным ухілам быў толькі другім у сваім родзе на ўсёй тэрыторыі Беларусі. У сям'і да гэтага па-беларуску ніхто не размаўляў, мы з бацькамі і нават з бабуляй, якая пераехала з Заўралля, разам рабілі першыя крокі ў вывучэнні беларускай мовы.

З самага пачатку адчувала сябе абсалютна камфортна, таму што і ўсе астатнія дзеці былі з рускамоўных сем'яў, а беларускую мову мы вучылі на ўроках усе разам. Цяжкай адаптацыі не было, на мой погляд, таму, што дзеці — паліглоты, яны на інтуітыўным узроўні значна лепей, чым дарослыя, успрымаюць іншыя мовы. Дарэчы, свайму сыну нанач я спяваю калыханкі на беларускай мове, і ён усё разумее.

Пасля школы для мяне на працягу 4 гадоў больш блізкай была беларуская мова: я думала па-беларуску, таму кожную фразу пры размове прыходзілася ў галаве перакладаць, я нават сны бачыла беларускамоўныя. Але потым асяроддзе зрабіла сваю справу, і я вярнулася да рускай.

Шчыра кажучы, для свайго дзіцяці я спецыяльна не шукала б сад або школу з беларускай мовай навучання, для мяне больш прынцыповыя іншыя параметры — блізкасць да дома, прафесіяналізм педагогаў, чалавечнае стаўленне да вучняў. Але калі б мне прапанавалі дзве абсалютна аднолькавыя па вышэйпералічаных параметрах школы, то я выбрала б беларускамоўную. Рускай мовай дзіця карыстаецца ў паўсядзённым жыцці і таму валодае ёй нядрэнна, а вось беларускую мову вывучаць 2-4 гадзіны на тыдзень — гэта вельмі мала. Усё ж такі беларус павінен ведаць яе як родную, а не як замежную. Навучанне ў беларускім садку ці школе дасць дзіцяці ў далейшым магчымасць выбару мовы для паўсядзённых зносін.

РЫХТАВАЦЬ ТРЭБА ЗАГАДЗЯ

Уражанні ад зносін з выпускнікамі беларускамоўных навучальных установ у Аксаны станоўчыя. Але для таго, каб канчаткова пераканацца ў правільнасці прынятага рашэння, звяртаемся да **псіхолага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей Юліі ЯЎЛАШ.**

— Сам па сабе факт навучання на беларускай мове для дзіцяці з рускамоўнай сям'і стрэсам не з'яўляецца. Аднак да паходу ў такую навучальную ўстанову яго абавязкова трэба рыхтаваць загадзя: тлумачыць, чаму гаворка адрозніваецца ад звыклай, разбіраць разам незразумелыя словы, чытаць кнігі. Многае залежыць ад матывацыі бацькоў. Калі яны хочуць аддаць сваё дзіця ў беларускамоўны садок ці школу толькі таму, што ў іх у свой час не было магчымасці добра вывучыць беларускую мову, то, хутчэй за ўсё, з гэтай задумы нічога добрага не атрымаецца. Аналогія — няўдачлівыя балярыны або піяністы, якія пераносяць свае жаданні на дзяцей. Не лепшая матывацыя і з дапамогай дзіцяці далучыцца да беларускамоўнага асяроддзя. Праваднiком мусіць быць дарослы, але не дзіця.

Бацькі абавязкова павінны растлумачыць, што ў тым, каб чымсьці адрознівацца ад іншых, у тым ліку і мовай зносін, няма нічога страшнага. Гэта дазволіць выпрацаваць правільнае стаўленне да свету. Дзеці звычайна значна лягчэй, чым дарослыя, успрымаюць новыя ўмовы, і пераход на іншую мову праходзіць для іх бязбольна. Калі ж у дзіцяці назіраюцца цяжкасці з адаптацыяй, то яго варта паказаць псіхолагу. Хутчэй за ўсё гэта будзе выклікана не беларускай мовай навучання, а моцнай нагрузкай.

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

У ЛЯСАХ ЗНОЎ ЗАБЛУДЗІЛІ ГРЫБНІКІ

На шчасце, усе яны здолелі знайсці дарогу з гушчароў

Удзень у суботу ў пажарную аварыйна-ратавальную часць №2 Глыбоцкага аддзела МНС паступіла паведамленне аб тым, што ва ўрочышчы Пушча-Галубіцкая, каля вёскі Шылагор'е, згубіліся трое — дзве жанчыны і мужчына. Раніцай яны адправіліся ў лес для збору грыбоў і заблукалі. Тэлефанавала з просьбай аб дапамозе адна з жанчын.

У пошукавых работах былі задзейнічаныя супрацоўнікі РАУС і МНС. Папятляўшы каля пяці гадзін у лесе, грыбнікі выйшлі на гукавы сігнал аўтацыстэрны МНС.

На наступны дзень паведамленне ратаўнікам аб жанчыне, што заблудзіла, паступіла таксама з Віцебскай вобласці — на гэты раз з Расонскага раёна. Амаль цэлы дзень правяла ў лесе жыхарка Расон, якая адправілася ў грыбы каля вёскі Фаміно. А дзявятай гадзіне вечара жанчына выйшла на гук сірэны аўтамабіля ратаўнікоў.

Паведамленне пра заблудную таксама паступала з Талачынскага раёна — пенсіянерка з вёскі Новае Сяло, паблукаўшы па лесе, самастойна выйшла з гушчару з надыходам цемры.

Ратаўнікі нагадваюць: будзьце асцярожныя падчас «ціхага палявання». Вывучыце карту мясцовасці, куды ідзяце. Збярыце мінімальны набор неабходных сродкаў, вазьміце з сабой зараджаны тэлефон.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

■ Гасцёўня «Звязды»

ГІСТОРЫЯ «ЗАЧАПІЛА» І НЕ АДПУСКАЕ

ВЯДОМЫ КРАЯЗНАЎЦА ПРА ХАРАКТАР ШАГАЛА І ТАЯМНІЦЫ ВІЦЕБСКА

Валерый ШЫШАНАЎ.

Жыццё Рэпіна пад Віцебскам, біяграфія Шагала, дзейнасць стваральнікаў новага мастацтва, губернатары і паслярэвалюцыйныя газеты — гэтыя і іншыя тэмы вывучаў вядомы гісторык, краязнаўца Валерый ШЫШАНАЎ. 9 гадоў ён — намеснік па навуковай рабоце дырэктара Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. Да гэтага працаваў у музеі-сядзібе Рэпіна «Здраўнёва», у музеі Марка Шагала, аўтар некалькіх кніг, соцень навуковых і газетных публікацый, удзельнік дзясяткаў міжнародных канферэнцый і чытанняў. З Валерыем Шышанавым пагутарыў карэспандэнт «Звязды».

— Ведаю, што вы са школьнай парты захапляліся гісторыяй... Няўжо не марылі стаць ваенным, касманаўтам?

— Я маркі па тэме космасу збіраю *(смяецца)*. Гісторыя ж «зачапіла» і не адпускае, хоць бацькі былі далёкія ад навукі. Тата працаваў вадзіцелем, мама — бухгалтарам. Нарадзіўся ў Віцебску, і цікава было ў школе больш ведаць пра яго, чым надрукавалі ў кніжках. У школьным атэстаце па гісторыі — «5», як і амаль што па ўсіх іншых прадметах. У 1980-я гады актыўна вяліся раскопкі: каля цяперашняга будынка амфітэатра, на тэрыторыі, дзе рэшткі Дабравешчанскай царквы XII стагоддзя. Напрасіўся на раскопкі. Шмат чаму навучыўся ў вядомага археолага Таццяны Бубенькі... У клубе нумізматаў юнаком пазнаёміўся з Аркадзем Падліпскім, вядомым, і цяпер старэйшым па ўзросце, краязнаўцам. Ад яго ўпершыню пачуў, што ў Віцебску пасля рэвалюцыі была вядомая мастацкая школа.

— Валерый Аляксеевіч, пасля школы адразу паступілі ў віцебскую ВНУ?

— У ПТВ. Тады не давалі адтэрміноўку ад арміі, і пайшоў я вучыцца на слесара механазборачных работ. У войску служыў пад Рыгай — у радыётэхнічных войсках. Потым працаваў рабочым на прадпрыемстве «Віцязь», дзе вырабляюць тэлевізары. Паступіў на завочнае аддзяленне гістарычнага факультэта Гродзенскай ВНУ. Тады ў Віцебскім педінстытуце гістфака не было. З 1992-га, калі яшчэ дыплом не атрымаў, пачаў працаваць у музеі-сядзібе Рэпіна «Здраўнёва», філіяле Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. Падчас вучобы працаваў у архівах у Санкт-Пецярбургу, Маскве, іншых гарадах. Потым удзельнічаў у навуковых канферэнцыях.

— Можа, пра Рэпіна нешта раней невядомае знайшлі ў архівах?

— Не люблю, як кажуць, «выстаўляць сабе наперад». «Я знайшоў...» Паверце, у Віцебску шмат спецыялістаў, якія зрабілі нямала цікавых адкрыццяў. Пашанцавала знайсці мноства дакументаў, якія датычацца гісторыі сядзібы, школы, створанай у 1918 годзе. Там выкладала малодшая дачка Рэпіна. Усяго ў яго было тры дачкі і сын. Мастак у гэты час жыў у іншай сядзібе — «Пенаты». І аказаўся ў вымушанай эміграцыі, бо тэрыторыя, дзе знаходзіцца сядзіба, адышла да Фінляндыі. Я атрымаў копіі фота будынка сядзібы пад Віцебскам, а таксама самога Рэпіна. Іх зрабіў Сігізмунд Юркоўскі, знакаміты фатограф, вынаходнік. Да гэтага ў Віцебску былі акварэлі цесця Рэпіна і пару фота. Па іх сядзібу і аднавілі.

— Наколькі яна адпавядала першапачатковаму выгляду?

— Звонку аднавілі будынак даволі дакладна. Нагадаю, што аўтэнтычны разабралі на дровы ў 1930-м... Сумны час быў у нашай гісторыі. Дарэчы, напэўна, мала хто ведае, што ідэя аднавіць сядзібу Рэпіна на афіцыйным узроўні была агучана яшчэ ў 1970 годзе. Але заказ на праект быў падрыхтаваны толькі ў 1976-м. Аўтар праекта Павел Кракалёў. І толькі ў 1988-м будынак аднавілі. А ў 1995-м сядзіба згарэла. Пажар узнік з-за кароткага замыкання — вынік парушэнняў пры мантажы праводкі.

— Нават Філіпа Кіркорава прасілі дапамагчы грашыма ў аднаўленні сядзібы.

— Гэта было на яго «Зорным часе» ў прэс-цэнтры фестывалю «Славянскі базар у Віцебску». Людміла Крушынская, тады рэдактар газеты «Культура», нагадала «зорцы», што ён там быў з бацькам, з Алай Пугачовай. Але ніякай дапамогі спявак не аказаў, як і многія іншыя вядомыя асобы.

Дзякуй супрацоўнікам газеты «Культура» і асабіста Людміле Крушынскай. Актыўна пісалі пра сядзібу. Штогод на «Базары» журналісты прыязджалі да нас і запрашалі артыстаў, мастакоў, акцёраў... У 1999-м прыехалі сур'ёзныя людзі і сказалі, што на высокім узроўні прынята рашэнне аказваць дапамогу. І тады справы пайшлі хутка. 5 ліпеня 2000 года музей урачыста адкрылі з удзелам Прэзідэнта...

Ужо традыцыйна штогод на «Базары» ў «Здраўнёве» прымаюць падарункі ад імя кіраўніцтва Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі: копіі твораў, фота, кнігі...

Дзякуй і мецэнатам з Санкт-Пецярбурга. Зусім небагатыя людзі: пенсіянеры, прадстаўнікі інтэлігенцыі стварылі «Клуб сяброў Здраўнёва». Яны купляюць ці дораць асабістыя антыкварныя рэчы.

— Дарэчы, цікава, што арыгіналы работ Рэпіна былі перададзены са сталічнага музея. Звычайна ж наадварот?

— Так. З Мастацкага музея Беларусі былі перададзены рэпінскія работы: у 1963-м — малюнак «Пропаведзь Іасафата Кунцэвіча», жывапісны твор «Партрэт дэзерціра» і ў 1990 годзе — абразы «Маці Божая з дзіцем» і «Хрыстос з чашай». Апошнія былі напісаны для царквы вёскі Слабада (недалёка ад Віцебска). Каля гэтага храма быў пахаваны бацька Рэпіна. Іх у 1939 годзе з Віцебска перадалі ў Дзяржаўную карцінную галерэю (цяпер згаданы вышэй музей). Так што мінчанам — шчыры піетэт за тое, што вярнулі!

Але і на сёння ў маскоўскіх і іншых музеях можна ўбачыць тое, што калісьці захоўвалася ў Віцебску.

— Пасля Рэпіна вы шчыльна заняліся Шагалам?

— У 2000 годзе ўладкаваўся навуковым супрацоўнікам у музей Шагала. А ў «Здраўнёва» працягваў працаваць на паўстаўкі.

Дзякуючы вельмі энергічнай дырэктарцы Людміле Хмяльніцкай шмат карыснага было зроблена. У музеі праходзілі «Шагалаўскія чытанні», шматлікія выставы, выдавалі бюлетэнь, раней на ініцыятыве спадарыні Хмяльніцкай выходзіў часопіс «Віцебскі сшытак» (першы нумар выйшаў у 1995 годзе).

Цікава было адшукаць нешта ў архівах па шагалаўскай тэме. Шмат чаго прачытаў у паслярэвалюцыйных газетах. У Маскве азнаёміўся з «асабістай справай» жонкі Шагала часоў, калі яна вучылася на Маскоўскіх вышэйшых жаночых курсах У. Гер'е (1907—1914 гг.). Раней падрабязнасці гэтага былі невядомы.

— На жаль, «завісла» ідэя аднавіць гатэль «Брозі», дзе Бэла жыла з бацькамі...

— Так. Пра тое, што ў Віцебску збіраюцца гэта зрабіць, пісалі не толькі мясцовыя газеты. І «Звязда» таксама. Але, наколькі ведаю, у інвестара змяніліся планы. Будынак знаходзіўся недалёка ад ратушы. На яго месцы няма капітальных забудоў. Такім чынам шчыра веру, што «Брозі» некалі адновяць. Дом можна было б выкарыстоўваць для патрэб шагалаўскага музея. Ён, нягледзячы на ўсю павагу да яго і разуменне значнасці, патрабуе большай увагі і лепшага будынка для арт-цэнтра (там знаходзіцца графіка Шагала): для экспазіцыі, для бібліятэкі (дарэчы, вельмі каштоўнай), фондавых памяшканняў. Праўда, ёсць задума перасялення арт-цэнтра Марка Шагала на вуліцу Калініна. Але, у любым выпадку, было бы вельмі добра аднавіць будынак, звязаны з Шагалам. Наогул у Віцебску на сёння няма выставачных залаў сучаснага ўзроўню. Дзіўна, але факт.

— Кансультавалі Аляксандра Міту, які ў Віцебску здымаў фільм пра Шагала і Малевіча?

— Міта прачытаў маю кнігу пра Віцебскі музей сучаснага мастацтва часоў Шагала. Яна, па словах рэжысёра, яму дапамагла ў рабоце над тэмай.

— У фільме, які, дарэчы, многім гараджанам не спадабаўся, а іншым — наадварот, Шагал у вобразе рамантыка, які марыў ператварыць Віцебск у другі Парыж. А якім вы ўспрымаеце гэтага чалавека, мастака?

— У адрозненне ад Малевіча, Шагал быў больш мяккі па характары. І сама творчасць яго гаворыць пра гэта. Малевіч быў уладны, лідар. Наконт камісара Шагала, пра якога з гумарам успамінаюць некаторыя крытыкі, дык ён жа афіцыйна займаў пасаду — упаўнаважаны па справах мастацтваў. А кім ён павінен быў быць у той час, каб ствараць мастацкія школу, вучылішча?

— Вам, напэўна, вельмі прыемна, што ў знакамітым губернатарскім палацы плануецца адкрыць філіял краязнаўчага музея?

— Будынак добры. Нагадаю, там і Напалеон на два тыдні спыняўся. У Другую сусветную ад інтэр'ера нічога не засталося. Але вонкавыя сцены не пацярпелі. У цэнтры горада ўзводзіцца новы будынак для абласнога ўпраўлення КДБ, якое займае цяпер былы палац. Пасля яго пераезду створыцца выключная сітуацыя, калі ў выдатным гістарычным будынку мог бы размясціцца музей. Як гэта адбылося, напрыклад, у Гомелі. Безумоўна, нам будзе што паказаць там, чым здзівіць...

У аддзеле рукапісаў нацыянальнай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу знайшоў цікавыя звесткі пра першага грамадзянскага губернатара Сяргея Шышкіна. Ён на пасадзе быў з 1802-га па 1806 год. Вельмі цікавы час, бо сучасная Віцебшчына яшчэ нядаўна была тэрыторыяй польскага ўплыву. Адпаведна новую ўладу прадстаўнікі мясцовай эліты не ўспрымалі, як хацелася б у царскай Расіі. Губернатар рабіў многае, каб паўплываць на думкі, прынцыпы. Была ў яго і любоўная гісторыя. Ён пакінуў нашчадкам даволі цікавыя ўспаміны.

— Віцебскі абласны краязнаўчы музей мае нешта сапраўды ўнікальнае?

— Калекцыя музея пачыналася і з прыватнай — Антона Брадоўскага. Ён збіраў манеты, старую зброю, прадметы антыкварыяту...

Масонская калекцыя не мае аналагаў не толькі ў Беларусі. Яна да рэвалюцыі належала віцебскаму адвакату Вацлаву Федаровічу. Калекцыю яшчэ падчас Першай Сусветнай хацелі вывезці, прадаць. І пасля 1917-га таксама. Але нейкім цудам не атрымалася.

Дарэчы, завяршылася работа па стварэнні новай экспазіцыі Музея прыватных калекцый — філіяла краязнаўчага. Некалькі гадоў таму яго зачынілі. А цяпер адкрылі ў іншым будынку — былым літаратурным музеі — недалёка ад Летняга амфітэатра (праспект Фрунзэ).

У іншым нашым філіяле — Мастацкім музеі — ёсць самая вялікая ў свеце калекцыя твораў Пэна — настаўніка Шагала. Там жа — арыгіналы Хруцкага, Шышкіна і іншых знакамітых мастакоў.

Па колькасці экспанатаў наш музей, скажам так, у «залатой сярэдзіне» сярод абласных цэнтраў і Мінска. Штогод арганізуем каля 120 выстаў. Але, паўтаруся, не хапае месца, каб адначасова выставіць многае з таго, што ў нас ёсць.

— У час гаджэтаў меней наведвальнікаў?

— Наадварот, штогод іх колькасць павялічваецца. Некаторыя потым прыводзяць сваякоў, сяброў. Пенсіянеры дораць рарытэтныя фота, рэчы. Вельмі папулярныя акцыі: «Ноч музеяў», «Дзень нараджэння ў музеі», «Вяселле ў музеі». Музеі не адстаюць ад часу. І мінулае заўсёды будзе цікавіць...

— А вы так і не ажаніліся?

— Вы не першы раз пра гэта мяне пытаеце. Не пакахаў! Калі знайду тую адзіную, да якой будзе цягнуць пасля работы, з якой буду, як кажуць, «на адной хвалі», — абавязкова! І вас запрашу на вяселле адным з першых!

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

■

УСЕ ДАРОГІ ВЯДУЦЬ У... МІР

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Але выданне кніг і навуковыя даследаванні праходзяць у комплексе з арганізацыяй навуковых канферэнцый для спецыялістаў?

— Так, за гэтыя гады іх у нас прайшло шмат. Сёлета ў якасці асноўнай на канферэнцыі мы ўпершыню выбралі музейную, а не гістарычную тэму. Наш форум быў прысвечаны рэканструкцыі, рэстаўрацыі і атрыбуцыі музейных прадметаў. Зімой, калі няма вялікай колькасці турыстаў, нашы навуковыя супрацоўнікі маюць больш часу для даследаванняў, работы ў архівах і бібліятэках. І за апошнія дзве зімы ў Міры зроблена шмат па атрыбуцыі экспанатаў. Мы таксама ўбачылі, што гэтая тэма на навуковых канферэнцыях у Беларусі не прадстаўлена. Часам чытаюцца асобныя даклады, прысвечаныя жывапісу, зброі, але комплекснага абмеркавання яшчэ не было. І не памыліліся. Бо на канферэнцыі прысутнічалі слухачы з прафільных цэнтраў па рэстаўрацыі з Масквы, Санкт-Пецярбурга, Вільнюса. Яны прыехалі проста каб паслухаць нашых дакладчыкаў! Натуральна, з дакладамі выступалі і супрацоўнікі музея. Мы прадставілі вынікі даследавання шпалераў, якія збіраем. Летась нашы навуковыя супрацоўнікі былі на стажыроўцы ў Абюсоне ў Францыі, дзе створаны тры з нашых васьмі шпалераў. Пагадзіцеся, сумесныя з французскімі калегамі вынікі даследаванняў ужо маюць вагу. Адметна таксама, што нашы навукоўцы не працуюць «у стол», як гэта часам бывае ў навуковых установах, калі даследаванне доўга чакае публікацыі.

«Ёсць традыцыя крыху прыхоўваць свае даследаванні, але я лічу, што нават трохі сыраватым матэрыялам можна дзяліцца. Гэта прыносіць плён».

— І гэта нядзіўна, бо замкавы комплекс «Мір» мае выдавецкую ліцэнзію і ажыццяўляе падрыхтоўку выданняў.

— Так, мы актыўна працуем у кірунку выдання кніг. Але не толькі так прадстаўляем свае напрацоўкі. Напрыклад, зараз рыхтуецца выпуск «Беларускага гістарычнага часопіса», цалкам прысвечаны Мірскаму замку. Там будуць і артыкулы нашых супрацоўнікаў, і працы іншых гісторыкаў. Але у гэтым часопісе будзе змешчана ўсё самае новае, самая свежая інфармацыя, якая яшчэ нідзе не фігуравала. Сама я падрыхтавала артыкул, прысвечаны картам, на якіх ёсць Мірскі замак. Сёлета ў лютым я знайшла ў архіве ў Германіі калекцыю карт Вітгенштэйнаў, на чатырох з іх намаляваны Мірскі замак. І самі выявы, і іх аналіз у гэтым тэматычным выпуску будуць прадстаўленыя ўпершыню.

— Вы неаднаразова падкрэслівалі імкненне зрабіць калекцыю Мірскага замка, ды і саму ўстанову ўнікальнай — сабраць прадметы, якіх няма больш нідзе, праводзіць імпрэзы, якія іншыя не ладзяць, арганізоўваць выстаўкі, якія не пабачыш у іншых месцах...

— А яшчэ не так даўно мы набылі калекцыю вееру, што ўключае больш за 40 прадметаў. Я бачу праблему нашых музеяў у адсутнасці ці малой колькасці калекцый. Іх зборы фарміраваліся з асобных рэчаў. І калі мы маем, напрыклад, некалькі цвікоў, кавалак старажытнай тканіны, тры крэслы, то прадставіць іх разам на выстаўцы амаль немагчыма. Выстаўкі робяцца на падставе калекцый. Таму мы вылучылі некалькі кірункаў — сярод іх вееры, шпалеры, шляхецкія срэбныя гузікі. Дарэчы, калекцыю апошніх мы збіраем каля года і маем у ёй ужо больш як паўтары сотні прадметаў. Рэдкія рэчы, якімі проста ніхто не цікавіўся. Калі ў мяне пытаюцца, навошта мы набываем так шмат дарагіх рэчаў, я прыводжу такую статыстыку: наш асноўны фонд складае прыкладна паўтары тысячы прадметаў, у Карэліцкім краязнаўчым музеі — іх 11 тысяч, Гродзенскім абласным музеі — 172 тысячы. Зразумела, мы — малады музей, у нас няма рэчаў, іх трэба шукаць і набываць. Значную частку зароблены на продажы квіткоў грошай укладаем менавіта ў гэтую справу.

«Калі мы маем, напрыклад, некалькі цвікоў, кавалак старажытнай тканіны, тры крэслы, то прадставіць іх разам на выстаўцы амаль немагчыма».

— А як яшчэ зарабляе ўстанова?

— Нечакана прыбытковай аказалася выдавецкая дзейнасць. Летась мы надрукавалі спадарожнік-даведнік па Мірскім замку. Ён складзены такім чынам, што распавядае наведвальніку пра кожную з залаў замка. Мару ўбачыць на адной паліцы каля паўтара дзясяткаў такіх кніг на розных мовах, але пакуль мы прапануем даведнікі толькі на шасці мовах. Летась у маі надрукавалі першы з іх — па-руску, тыражом 10 тысяч асобнікаў. І зараз фактычна ўвесь наклад раскуплены. Ёсць даведнікі на беларускай, польскай, англійскай, французскай, літоўскай мовах. Натуральна, яны не так хутка прадаюцца, але ўсё ж запатрабаваныя.

— Калі казаць пра новыя рэчы для музея, то дзе іх шукаеце?

— Набываем і ў мясцовых жыхароў, і ў калекцыянераў. Адзін з апошніх набыткаў — сталярная майстэрня князя Святаполк-Мірскага, якая знаходзілася ў замку, мадэлі, зробленыя там у 1930-я гады. Трапляюцца і старыя кнігі. А не так даўно набылі альбом фотаздымкаў часоў Першай сусветнай вайны. Некаторыя калекцыянеры-прафесіяналы з Мінска і іншых гарадоў па заказе для нас шукаюць рэчы. На аўкцыёнах за мяжой працаваць не даводзілася, бо пакуль не адпрацаваны механізм набыцця. Часам нам робяць падарункі нашчадкі асоб, чый лёс звязаны з Мірскім замкам. Нядаўна падарылі калекцыю асабістых рэчаў Освальда Руфайзена, яўрэя, які падчас вайны паведаміў вязням Мірскага гета пра тое, што іх збіраюцца забіць, дапамог са зброяй і выратаваў тых, хто здолеў уцячы.

— Вы ўжо адзначылі неверагодную знаходку карт у архіве Германіі. Напэўна, яны маюць карысць і для ўладкавання тэрыторыі Мірскага замка?

— Сапраўды. Цяпер мы маем шмат новых дакументаў, што тычацца непасрэдна Мірскага замка, маёнтка Замір'е, карты часоў Святаполк-Мірскіх, з дапамогай якіх можна параўнаць сучасны стан тэрыторый з тым, што было раней. Напрыклад, мы дакладна высветлілі, дзе знаходзіўся той сад, які ў адпаведнасці з легендамі высеклі падчас квітнення і на яго месцы выкапалі возера. Яно вялікае, але дзе дакладна быў сад, мы не ведалі. Цяпер гэта нам вядома.

— Сад — толькі адна з замкавых легендаў, таксама неаднаразова расказваюць пра ўласцівасць замка «хавацца» ў цемры. Працуючы і нават жывучы тут ужо столькі гадоў, магчыма, заўважылі яшчэ нешта незвычайна-містычнае?

— Калі я пачала тут працаваць і жыла ў замку, часам, позна вечарам вяртаючыся з камандзіровак, нават баялася. Ідзеш-ідзеш у цемры — і раптам апынаешся каля сцяны замка. Яго сапраўды не было відаць з дарогі! Таму мы павесілі некалькі ліхтароў на тэрыторыі, якія ўсю ноч свецяць. Мясцовыя жыхары кажуць таксама, што замак прыцягвае да сябе тое, што яму патрэбна. Было некалькі такіх гісторый. Я сама здзіўлялася. У нас узнікала нейкая праблема, раптам званіў тэлефон і гучала прапанова менавіта таго, што было патрэбна. Але, магчыма, гэта можна патлумачыць законамі фізікі. Замак — вялікі, цяжкі мураваны будынак, які прыцягвае да сябе аб'екты.

— Напэўна, вельмі складана быць дырэктарам такой вялікай установы, вырашаць гаспадарчыя пытанні, звязаныя з будаўніцтвам, рэстаўрацыяй? Яны ж часам зусім не жаночыя.

— У нас вельмі добрая гаспадарчая служба, якая вырашае ўсе гэтыя пытанні. Хоць вельмі часта прыходзіцца чытаць, разбірацца ў некаторых момантах. Напрыклад, не так даўно я сустракалася з кіраўніком праекта рэстаўрацыі замка, архітэктарам Дзмітрыем Бубноўскім, мы абмяркоўвалі перспектывы работ у флігелі. Узнікла пытанне правядзення ацяплення. А я кажу: выкарыстаем цеплавую помпу. Ён вельмі смяяўся і казаў, што здзіўлены, што я ведаю пра існаванне такіх рэчаў. Калі я вымушана прымаць рашэнне, то павінна ведаць, які выбар зрабіць. Магчыма, з-за сваёй работы пра цеплавыя помпы трохі больш ведаю, чым жанчына, якая не мае тэхнічнай адукацыі, але ў нас ёсць выдатныя спецыялісты, якія заўсёды падкажуць. Больш глыбока прыйшлося вывучаць юрыдычныя рэчы, калі мы афармлялі аўтарскія правы на назву «Мірскі замак», вопыту ў музеяў амаль не было — толькі Нясвіж перад намі, а ўжо пазней, на нашым вопыце вучылася Брэсцкая крэпасць. Рыхтуюся, раюся з юрыстамі, калі мне трэба падпісваць дамовы і прадстаўляць інтарэсы музея.

«Як навуковец ведаю, што знайсці адказ на пытанне, зрабіць адкрыццё — вялікае задавальненне. Як у рыбака, які выцягнуў рыбу, ці паляўнічага».

— Прыклад з адкрыццём картаў Вітгенштэйнаў, знакамітая знаходка невядомай калекцыі партрэтаў Радзівілаў у Баварыі даказвае, што даследчыцкія амбіцыі, імпэт у глыбокім вывучэнні сваёй тэмы вельмі дапамагаюць у працы. І калегам раіце быць больш смелымі, не баяцца стукацца ў дзверы?

— Як даследчык я магу сказаць дакладна: калі хочаш нешта даведацца, трэба ісці да першакрыніцы, да дакумента, аб'екта. Не праз інтэрнэт. Вопыт супрацы з Абюсонам даказвае, што гэта правільны падыход. Гледзячы на мяне, і нашы супрацоўнікі пасмялелі. Прывяду такі прыклад. У нас ёсць адна шпалера, зробленая ў Бельгіі. Самі супрацоўнікі знайшлі музей, які спецыялізуецца па гэтым тыпе шпалераў, напісалі ліст і атрымалі не толькі адказ на трох старонках — а гэта значыць, што і замежных калег зададзенае пытанне зацікавіла, — але і некалькі альбомаў. І пытанні зніклі, і супрацоўнікі пабачылі, што трэба быць смялейшымі. Ды і як навуковец ведаю, што знайсці адказ на пытанне, зрабіць адкрыццё — вялікае задавальненне. Як у рыбака, які выцягнуў рыбу, ці паляўнічага. Гэта азарт, я вельмі рада, што ён прысутнічае і ў нашых супрацоўнікаў. Дарэчы, трэба вельмі шмат камунікаваць з калегамі. Людзі працуюць у розных архівах, выпадкова могуць сустрэць патрэбны дакумент. Я шмат расказваю пра тое, чым займаюся, не трымаю ў сакрэце.

«Магчыма, з-за сваёй работы пра цеплавыя насосы трохі больш ведаю, чым жанчына, якая не мае тэхнічнай адукацыі».

— А як жа даследчыцкая скупасць, нават рэўнасць да адкрыццяў?

— Так, ёсць традыцыя крыху прыхоўваць свае даследаванні, але я лічу, што нават трохі сыраватым матэрыялам можна дзяліцца. Гэта прыносіць плён. Але калі карыстаюцца маімі матэрыяламі, прашу, каб пазначылі, што гэта выяўлена мной. Ды і калегі-гісторыкі таксама са мной часта дзеляцца сваімі знаходкамі.

— Над чым працуеце цяпер? Што пабачаць наведвальнікі Мірскага замка бліжэйшым часам? Якія новыя выдавецкія праекты рыхтуеце?

— Скончаны макет кнігі, першай у серыі, што будзе расказваць пра фарміраванне калекцыі музея «Замкавы комплекс «Мір». На яе старонках разам з Надзеяй Усавай — яна доўгі час была намеснікам дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея, адказвала за навуку — мы расказваем пра гісторыю рэчаў, што захоўваюцца ў Мірскім замку. Пасля будзем друкаваць вузкатэматычныя каталогі, напрыклад, пра нашу мэблю, выяўленчае мастацтва. Амаль скончана калектыўная манаграфія, прысвечаная роду Вітгенштэйнаў, у ёй шмат знаходак, мы адкрылі Вітгенштэйнаў таксама і як мецэнатаў XIX стагоддзя, у той час яны фактычна перахапілі ў Радзівілаў функцыю падтрымкі мастацтва, дапамагалі дзясяткам мастакоў, скульптараў, архітэктараў, сябравалі з Бруловым, Кіпрэнскім. Наведвальнікаў чакаюць і яркія выставачныя праекты — некаторыя з іх сумесныя з музеямі са Смаленска, Стакгольма. Наш музей вельмі актыўна развіваецца, тут сабралася вельмі добрая каманда. Разам ужо можам горы зрушваць, праўда, пакуль невялікія.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

Отдел принудительного исполнения Поставского района Витебской области объявляет торги по продаже следующего имущества, принадлежащего Юревичу Андрею Антоновичу:

ЛЕГКОВОЙ АВТОМОБИЛЬ SKODA SUPERB АМБИШН,

2011 года выпуска, регистрационный знак 2137 ЕВ-2 кузов №TMBAB43T2B9054894, цвет – бордовый металлик, свидетельство о государственной регистрации ВВА 071128 от 20.09.2011 года

Первоначальная цена – 19 118,40 (девятнадцать тысяч сто восемнадцать белорусских рублей 40 копеек).

Торги состоятся 19.10.2016 года в 11.00
в здании отдела принудительного исполнения Поставского района по адресу: Витебская область, г. Поставы, ул. Ленинская, д. 141, каб. 4.

Лица, желающие принять участие в торгах, до 17 октября 2016 года обязаны:
- подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством;
- внести задаток в размере 10% от стоимости продаваемого имущества на депозитный счет отдела принудительного исполнения Поставского района р/с 3642903000168 в ЦБУ №230 г. Поставы, ф-ла 216 АСБ «Беларусбанк» г. Полоцк МФО 648, УНН 300002505;
- документ, подтверждающий факт оплаты не позднее **17 октября 2016 года** представить в отдел принудительного исполнения Поставского района.

Минимальная величина первого шага составляет 5 процентов стоимости реализуемого с торгов имущества. В соответствии со статьей 385 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

По вопросу участия в торгах обращаться в отдел принудительного исполнения Поставского района по тел.: 8-033-399-56-27, 802155-273-99.

Минский городской центр недвижимости

Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»

СООБЩАЕТ О ВНЕСЕНИИ СЛЕДУЮЩИХ ИЗМЕНЕНИЙ
в извещение о проведении 27 сентября 2016 года 193-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности (опубликовано в газете «Звязда» 23.08.2016):

- предмет аукциона № 89 исключается из текста публикации в связи с отказом арендодателя от проведения аукциона.

Телефон для справок +375 (17) 327 40 22.
Адрес в сети интернет: www.mgcn.by.

УНП 190398583

Минский городской центр недвижимости

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»

24 октября 2016 г. в 11.30 на электронной торговой площадке «МИНСК–НЕДВИЖИМОСТЬ» (http://minskestate.by) проводит электронные торги по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске

Предмет электронных торгов: право заключения договоров аренды земельных участков сроком на 5 лет

№ предмета аукциона	Месторасположение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь, га	Целевое назначение земельного участка/ назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества	Начальная цена предмета аукциона, рублей образца 2009 года/ рублей образца 2000 года	Сумма задатка, рублей образца 2009 года/ рублей образца 2000 года	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, рублей образца 2009 года/ рублей образца 2000 года	Отдельные условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	г. Минск, ул. Брикета	500000000006008293	0,9305	для строительства объекта производственного назначения/земельный участок для размещения объектов иного назначения	149 467,99/ 1 494 679 900	22 420,00/ 224 200 000	7 909,60/ 79 096 021	Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: общая площадь здания – до 16 000 кв. м, площадь застройки – до 6 000 кв. м, суммарная площадь всех этажей здания во внешних габаритах – до 19 000 кв. м, число сотрудников – до 150 чел.
2	г. Минск, в районе ул. Брикета–МКАД (34 км)	500000000006007843	3,5480	для строительства объекта «Административно-деловой комплекс в районе ул. Брикета–МКАД (34 км)»/ земельный участок для размещения объектов административного назначения	1 141 312,10/ 11 413 121 016	171 200,00/ 1 712 000 000	10 857,08/ 108 570 777	Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: общая площадь здания комплекса (подлежит уточнению проектом): 38 400 кв.м, в том числе паркинга – 12 000 кв.м, функциональное назначение объекта – объект административно-делового назначения, состав объекта – административно-деловой комплекс со встроенным паркингом. Возместить Минскому районному унитарному предприятию «Агрокомбинат Ждановичи» упущенную выгоду в размере 524,11 руб. (5 241 140 руб. без учета деноминации). Возместить в установленном порядке потери сельскохозяйственного производства, вызванные изъятием пахотных земель площадью 0,7476 га для использования их в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства в размере 45 570,10 руб. (455 701 090 руб. без учета деноминации) на счет по учету средств республиканского бюджета по месту постановки на учет плательщика с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения

Продавец: Минский городской исполнительный комитет, пр-т Независимости, 8, 220030, г. Минск, сайт: www.minsk.gov.by.

Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки: Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефоны: (017) 2261672, 327-40-22, сайт: **www.mgcn.by.**

Порядок проведения электронных торгов: электронные торги проводятся в соответствии с **регламентом** информационной торговой системы ЭТП «МИНСК-НЕДВИЖИМОСТЬ» (далее – Регламент) с соблюдением требований Положения о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №608 (далее – Положение).

Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на сайте ЭТП по электронному адресу **http://minskestate.by**, пройти аккредитацию на ЭТП, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП, а также оплатить оператору ЭТП компьютерные услуги согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в Региональной Дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, 220035, г. Минск, просп. Машерова, д. 80, УНП 190398583, получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению) не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах – **18.10.2016 г.**

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов.

Дата и время начала проведения электронных торгов: **24 октября 2016 года в 11.30** (по времени на сервере ЭТП «МИНСК-НЕДВИЖИМОСТЬ»).

Победитель электронных торгов либо претендент на покупку, выразивший согласие на приобретение земельного участка по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах электронных торгов либо признания торгов несостоявшимися, до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);
- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком на основании решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся, заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона **договор аренды земельного участка сроком на 5 лет**.

Размер штрафа, уплачиваемого участником электронных торгов и (или) их победителем (претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет:

по земельному участку для строительства объекта производственного назначения по ул. Брикета – 22 420,00 (двадцать две тысячи четыреста двадцать) рублей образца 2009 года или 224 200 000 (двести двадцать четыре миллиона двести тысяч) рублей образца 2000 года;

по земельному участку для строительства объекта «Административно-деловой комплекс в районе ул. Брикета–МКАД (34 км)» – 171 200,00 (сто семьдесят одна тысяча двести) рублей образца 2009 или 1 712 000 000 (один миллиард семьсот двенадцать миллионов) рублей образца 2000 года.

Прием заявлений на участие в электронных торгах с прилагаемыми документами осуществляется **по 18.10.2016** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пят

Краіна здароўя

Выпуск №16 (369)

■ Бацькоўскі клопат

РАСЦІЦЕ, ЗУБКІ, РОЎНЫМІ!

Усе бацькі хочуць, каб у іх дзяцей раслі здаровыя, роўныя зубы, але, на жаль, звяртаюць увагу на ўжо скрыўленыя, бо нічога не ведаюць пра тое, як фарміруецца прыкус.

А сапраўды, што перашкаджае яму фарміравацца правільна? Вядома, нейкая зубасківічная паталогія можа перайсці да дзіцяці ў спадчыну, але ёсць і яшчэ некаторыя важныя моманты, напрыклад штучнае кармленне замест груднога.

— Няправільна падабраная соска, з якой малако выцякае самастойна, прыводзіць да таго, што дзіця не смокча актыўна, як належыць, і ніжняя сківіца адстае ў развіцці ад верхняй, — тлумачыць **урач-артадонт 22-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Ірына КЛІМ**. — Паступова дзіця пачынае квола жаваць, прывыкае да ўсяго вадкага, а ад цвёрдай ежы адмаўляецца. Урэшце абедзве сківіцы не развіваюцца як належыць, а таму і зубы прарэзваюцца няправільна, і прыкус адпаведны.

Працяглае смактанне соскі-пустышкі таксама прыводзіць да той жа праблемы. Гэты рэфлекс падштурхоўвае дзіця да пастаяннага смактання пальца, губ, языка і г.д. Змагацца са шкоднай звычкай шляхам спроб і памылак — значыць траціць каштоўны час. А калі звярнуцца да ўрача-артадонта, то ён падбярэ для дзіцяці адзін з эфектыўных апаратаў, які хутка дазволіць пераадолець шкодную звычку.

Парушэнне прыкусу часта спалучаецца з рахітам і скаліёзам. Дэфіцыт такіх мінеральных рэчываў, як кальцый і фтор, вітаміну D прыводзіць да развіцця рахіту, што можа парушыць тэрмін прарэзвання зубоў. А няправільнае становішча галавы падчас кармлення і сну (закіданне, апусканне на грудную клетку, падкладванне рукі пад шчокі) парушае вертыкальную вось пазваночніка, тонус мышцаў, фарміруе няправільную паставу.

Крывым зубам можа паспрыяць і парушэнне дыхання. Пры прастудах дзіця вымушана дыхаць ротам, а гэта шкодна з усіх бакоў. Паветра, якое паступае ў лёгкія, не паспявае сагравацца, колькасць кісларoду ў ім зніжаецца, парушаецца цеплаабмен прыдатачных пазух. Усё гэта шкодна для агульнага развіцця дзіцяці. Калі малое дыхае ротам, шчокі празмерна ціснуць на зубныя рады і фарміруецца так званы адэноідны тып твару. Тут трэба падключаць ужо ўрача-атарыналарынголага, які дапаможа выявіць і выдаліць паліпы, адэноіды, скрыўленні насавой перагародкі. Выправіць прыкус зубоў у гэтым выпадку можна таксама з дапамогай тых жа спецыяльных апаратаў, якія вырашаюць увесь комплекс праблем: акрамя таго, пазбаўляюць шкодных звычак, яшчэ і аднаўляюць насавое дыханне, выпраўляюць зубы. Насіць іх дастаткова ноччу і пару гадзін днём.

Дэфармацыі могуць з'явіцца і ў выніку няправільнай дыкцыі, пракладвання языка паміж зубамі, што здараецца пры кароткай вуздэчцы языка. Тут не абысціся без хірургічнага ўмяшання і лячэння ў лагапеда.

Дэфекты могуць узнікаць і ў выніку несвоечасовага лячэння зубоў, заўчаснага іх выдалення — зубы тады могуць змяшчацца, а пастаянным не будзе хапаць месца. Так што неабходна своечасова ажыццяўляць пратэзаванне ■

■ Для мужчын

Рак прастаты? Па аналізе крыві

Рак прастаты займае першае месца сярод усіх злаякасных пухлін у мужчын. Штогод у краіне выяўляецца каля 3,5 тысячы новых выпадкаў раку прастаты. Некалі гэты від анкалогіі выяўляўся пераважна на позніх стадыях. Сёння ўсё больш тых, хто трапляе ў поле зроку спецыялістаў на ранніх, але да поспеху, які дасягнуты ў шэрагу развітых краін, мы пакуль не дайшлі.

— Западозрыць праблему раней можна з дапамогай аналізу крыві на прастатспецыфічны антыген (ПСА), што вельмі актыўна праводзіцца за мяжой. Прайсці такое даследаванне можа любы мужчына 50—55 гадоў пасля звароту да ўролага, — кажа **загадчык аддзялення анкаўралогіі Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансера Ігар МАСАНСКІ**. — Пачынаць абследаванне менавіта з гэтага ўзросту найбольш важна для тых, чые сваякі хварэлі на рак прастаты. Паўтараць правядзенне аналізу неабходна ў сярэднім раз на два-тры гады, калі ўролаг не параіў інакш. Нагул з кожным наступным дзесяцігоддзем рызыка развіцця захворвання нарастае, аднак у маладзейшым узросце гэты від раку паводзіць сябе больш агрэсіўна. Паводле даных амерыканскіх аўтараў, **каля 80 працэнтаў 80-гадовых мужчын маюць прыкметы злаякаснай пухліны ў прастаце**, але ў гэтым узросце пухліна можа ніяк сябе не праяўляць і не патрабаваць спецыяльнага лячэння...

Нават калі ў вас няма ніякіх скаргаў, вы можаце здаць аналіз крыві на прастатспецыфічны антыген. Калі ўзровень яго акажацца вышэйшым за 4 нг/мл, вам прапануюць зрабіць трансрэктальнае ўльтрагукавое даследаванне, якое сумяшчаецца з біяпсіяй і праводзіцца ў стацыянары. Бывае так, што ўзровень ПСА вельмі высокі, а марфалагічнае даследаванне нічога страшнага не паказвае. Не выключана, што біяпсійная іголка проста не трапіла ў тую тканку, у клетках якой пачаліся змены. У такім выпадку праз некаторы час урач прапануе біяпсію паўторыць. На дапамогу таксама можа прыйсці імунагістахімічная дыягностыка, якую ў Мінску выконваюць некалькі лабараторый, у тым ліку лабараторыя онкадыспансера. Выявіць захворванне можна і з дапамогай магнітна-рэзанаснага тамографа.

У якасці лячэння прымяняецца, як правіла, прастатэктамія — выдаленне прастаты хірургічным шляхам. Адрозненне аперацый пры раку прастаты і дабраякаснай гіперплазіі ў тым, што залоза ў першым выпадку выдаляецца цалкам — разам з часткай шыйкі мачавога пузыра, лімфавузламі, у якіх могуць быць метастазы. Аднак палавыя нервы, па магчымасці, пакідаюцца, што ў выніку дае шанц пазбегнуць такога ўскладнення, як імпатэнцыя. Усё, што выдалена, даследуецца пад мікраскопам, пасля чаго выстаўляецца стадыя, вызначаецца неабходнасць дадатковых метадаў лячэння і рэжым назірання.

Таксама добры вынік дае прамянёвая тэрапія. Для правядзення яе выкарыстоўваецца самае сучаснае абсталяванне, дзякуючы якому агульную прамянёвую нагрузку на арганізм можна знізіць, а ў месцы пухліны — павялічыць.

Прымяняецца і комплекснае лячэнне — прамянёвая тэрапія спалучаецца з гарманальнай. Гэта не гармоны ў чыстым выглядзе, а розныя рэчывы, здольныя блакіраваць працэс на клетачным узроўні. Лячэнне ажыццяўляецца і на чацвёртай стадыі, пакуль пухліна, што называецца, адгукаецца на яго. У выніку больш за 25 працэнтаў такіх хворых жывуць пяць і болей гадоў.

— Пасля прастатэктаміі ў пэўнай катэгорыі пацыентаў цягам некалькіх месяцаў можа захоўвацца стрэсавае нетрыманне мачы (у адказ на нейкую фізічную нагрузку), — кажа Ігар Масанскі. — Рэкамендуюцца ў такіх выпадках спецыяльныя практыкаванні для ўмацавання мышцаў таза, а таксама фізіятэрапія — электралячэнне, магнітатэрапія... Другі важны момант, які непакоіць нашых пацыентаў, — імпатэнцыя. Пры паказаннях мы прызначаем пэўныя лекі на розны тэрмін, але не заўсёды патэнцыя аднаўляецца. У часткі пацыентаў прымяняецца фізіятэрапія, вакуумная і гірудатэрапія. У Любані нават ёсць санаторый для мужчын з парушэннем палавой функцыі, у тым ліку для тых, хто перанёс падобную аперацыю. Крайні выпадак — пратэзаванне спецыяльнымі імплантамі. Пасля правядзення лячэння нашы пацыенты назіраюцца цягам двух гадоў у анкадыспансеры, а пасля па месцы жыхарства ў раённага анколага ■

Адэнома: залаты стандарт лячэння

Дабраякасная гіперплазія прастаты — гэта мужчынскі клімакс. Пасля 45—50 гадоў мяняецца гарманальны фон мужчынскага арганізма, што прыводзіць да разрастання залоз, якія ў некаторых выпадках пераціскаюць мочаспускальны канал. Як вынік — затрымка мачы, што, у сваю чаргу, прыводзіць да запалення ў нырках, утварэння камянёў у мачавых шляхах, ныркавай недастатковасці.

Адэнома прастаты сустракаецца ў 40 працэнтаў мужчын ва ўзросце 50—60 гадоў і ў 90 працэнтаў тых, каму за 80.

Для лячэння гэтага стану прымяняецца некалькі груп прэпаратаў, якія могуць быць прызначаны ўролагам пасля неабходнага абследавання. Працэс кансерватыўнага лячэння вельмі працяглы, а таму яго прызначаюць найперш узроставым хворым і тым, хто мае розныя іншыя паталогіі. Большасці пацыентаў выконваецца трансурэтральная рэзекцыя і лазерная адэномэктамія — малаінвазійныя спосабы хірургічнага ўмяшання, «залаты стандарт» дапамогі такім пацыентам. Выконваць аперацыі можна на самых ранніх этапах, не чакаючы вострай затрымкі мачы. Што да ўскладненняў, то звычайна ў адзінкавых выпадках можа быць часовая затрымка мачы, якая праходзіць праз 2-3 тыдні пасля аперацыі. Аднак існуюць і проціпаказанні да такога віду лячэння, а таму актуальным застаецца і адкрытае аператыўнае ўмяшанне.

■ Элементарныя рэчы

ТАК І РАБІЦЕ

Урач-атарыналарынголаг 2-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Вольга СТАРАВОЙТАВА рэкамендуе запомніць, як правільна рабіць некалькі важных рэчаў для максімальна эфектыўнага лячэння.

Як закапаць вушныя кроплі?

Сагрэйце іх да тэмпературы цела, асабліва калі яны захоўваліся ў халадзільніку. Нахіліце галаву на бок хворым вухам дагары. Калі капаем дарасламу, то адцягніце вуха крыху назад і ўгору, калі дзіцяці — назад і ўніз. Гэта неабходна для выпроставання слыхавога праходу і працякання кропляў да барабаннай перапонкі. Пасля таго, як закапалі, патрымайце галаву так, каб вуха «глядзела» ўверх.

Як закапаць кроплі ў нос?

Ідэальна, калі кроплі ў флаконе з распыляльнікам. Тады трэба сесці, крыху нахіліць галаву наперад і «закапаць» нос. Складаней, калі трэба капаць кроплі. У гэтым выпадку асноўная задача зрабіць так, каб кроплі засталіся ў поласці носа, а не трапілі ў горла. А таму капаць кроплі ў нос трэба, нахіліўшы галаву на бок і крыху назад.

Калі ўрач не рэкамендаваў інакш, то кроплі трэба капаць не больш за 3-5 дзён — каб не развіўся медыкаментозны рыніт. Калі мы капаем сасудазвужальныя кроплі, нос добра дыхае, аднак пры гэтым слізістай не хапае крыватоку і ў ёй назапашваюцца рэчывы сасударасшыральнага дзеяння. І чым больш мы капаем кроплі, тым больш выпрацоўваецца гэтых рэчываў — пакуль не наступае той момант, калі сасударасшыральнае дзеянне пачынае пераважаць. Узнікае медыкаментозны рыніт, пры якім неабходна поўнасцю адмяніць супрацьзастойныя прэпараты мясцовага дзеяння. Для паляпшэння стану можна арашаць слізістую растворам кухоннай солі, мінеральнай вадой без газу.

Навошта капаць кроплі ў нос, калі баліць вуха?

Пры развіцці запалення ў сярэднім вуху важнай часткай лячэння з'яўляецца забеспячэнне паступлення паветра. У сярэднім вуху гэтую функцыю выконвае слыхавая труба, якая пачынаецца ў поласці сярэдняга вуха, а заканчваецца ў насаглотцы. Аднак калі ў слыхавой трубе развіўся ацёк і запаленне, то яна не можа выконваць сваю функцыю. Таму неабходны сасудазвужальныя кроплі, якія капаюць па 5 кропляў на баку хворага вуха, закінуўшы галаву і пасля паварочваючы яе на хворы бок, каб прэпарат дасягнуў мэты ў слыхавой трубе.

Што рабіць пры насавым крывацёку?

Неабходна сесці, удыхнуць носам, а выдыхнуць ротам. Звонку прыласці холад. Варта прыціснуць крыло носа да перагародкі пальцам або ўвесці (неглыбока) ватны тампон, змочаны растворам перакісу вадароду. Калі крывацёк не спыніўся, тэрмінова звярнуцца да ўрача.

Як даваць суспензіі дзецям?

Мерныя лыжачкі і мензуркі, якія ідуць у камплекце з суспензіямі, не заўсёды зручныя. Часам цяжка адмераць дакладную колькасць, а часам дзіця проста круціць галавой. Аднак вельмі зручна даваць такія лекі са звычайнага медыцынскага шпрыца без іголкі (чайная лыжка — 5 мл, 1 мл — 20 кропляў). Тут любое дзіця можна пакласці і акуратна напаіць лекамі.

Як прымаць «тры разы на дзень»?

Так часта пішуць у рэцэптах. Аднак калі мы прымаем антыбіётыкі або іншыя прэпараты, не звязаныя непасрэдна з прыёмам ежы (як, напрыклад, стрававальныя ферменты), то размяркоўваць трэба не на дзень, а на суткі. Тры разы на суткі — праз 8 гадзін, два разы — праз 12 гадзін, а не перад сняданкам, абедам і вячэрай ■

■ Узрост жанчыны

«МОЖА ЦЯГНУЦЬ ДА САЛЁНАГА...»

Клімакс — цяжкае выпрабаванне для прыгожага полу

У 45—60 гадоў жаночы арганізм старэе, функцыя яечнікаў згасае, інтэрвалы паміж менструацыямі павялічваюцца і паступова яны знікаюць наогул. Прыкладна ў кожнай трэцяй гэта адбываецца раптоўна. Раняму спыненню менструальнай функцыі могуць спрыяць частыя роды, аборты і працяглае грудное кармленне, а позняму — міёма маткі, гіпертанія. Звычайна менапаўза працякае без ускладненняў, але так шанцуе не ўсім.

— Парушэннямі лічацца матачныя крывацёкі і клімактэрычны сіндром, які праяўляецца вялікай колькасцю непрыемнасцяў, — тлумачыць **урач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Ала ЯКІМЕНКА**. — Гэта, напрыклад, прылівы гарачыні да твару, галавы і верхняй часткі тулава. Сэрца можа біцца часта, узнікае патлівасць і галавакружэнне, слабасць, галаўны боль, боль у суставах, шум у вушах, парушаецца сон, павышаецца эмацыянальнасць, могуць з'явіцца і псіхічныя расстройствы. Устойлівасць да розных знешніх уздзеянняў, напрыклад да перамен надвор'я, істотна зніжаецца. Пры лёгкай ступені сіндрому можа быць да 10-ці прыліваў за суткі, пры сярэдняй — да 20-ці ў суправаджэнні галаўнога болю, галавакружэння, пагаршэння памяці і сну, што, безумоўна, зніжае працаздольнасць. Пры цяжкай ступені працаздольнасць страчваецца наогул...

Змены настрою — гэта павышаная раздражняльнасць, незадаволенасць навакольнымі, прыдзірлівасць і капрызнасць, трывога, туга, страхі і пастаянны неспакой. Узнікае абыякавасць да ўсяго, пачуццё бяссілля і спустошанасці. Раптоўна можа ўзнікаць пачуццё стомленасці, бывае цяжка сканцэнтраваць увагу і нават проста чытаць або пісаць. То хочацца бясконца спаць, то бяссонніца. Апетыт то нармальны, то паніжаны, то павышаны. Можа цягнуць да салёнага, кіслага ці чагосьці яшчэ. Скардзяцца жанчыны і на нейкія непрыемныя адчуванні то тут, то там, і гэта прымушае тут жа падазраваць туберкулёз, рак або штосьці іншае.

Майце на ўвазе, што клімактэрычны сіндром сярэдняй і цяжкай ступені патрабуе лячэння. Пры гэтым вы самі павінны паклапаціцца аб тым, каб у вашым жыцці быў рэжым дня, рацыянальнае харчаванне, лячэбная фізкультура, аздараўленчыя працэдуры, фізіятэрапія. Урач-псіхатэрапеўт можа прызначыць і прэпараты — седатыўныя, снатворныя, антыдэпрэсанты, нейралептыкі. Карысная будзе і нервова-мышачная рэлаксацыя, аўтатрэнінг, псіхалагічная падтрымка спецыяліста ■

■ Псіхалогія для ўсіх

СА СТРЭСАМ МОЖНА ЖЫЦЬ

Кожны з нас практычна штодня перажывае напружанне, стрэс. Пазбегнуць гэтага немагчыма. Нават станоўчыя падзеі кшталту адпачынку або прымірэння з каханым — таксама стрэс. Аднак чым больш падзей, якія выклікалі напружанне, і чым менш вы прыкладаеце намаганняў, каб справіцца з гэтым, тым вышэйшая верагоднасць узнікнення нейкага захворвання. Тут і парушэнні сэрцабіцця, і стойкі галаўны боль, мышачнае напружанне, спазмы, цікі, расстройства стрававання... А яшчэ — перапады настрою, раздражняльнасць, пастаянны неспакой, страта сімпатыі да навакольных і пачуцця гумару, схільнасць да песімізму... Ухіленне ад вырашэння надзённых задач, злоўжыванне алкаголем і транквілізатарамі, курэнне, узнікненне аварыйных сітуацый з траўмамі, непаразуменні з навакольнымі.



— Што нам усім патрэбна, дык гэта мудрае стаўленне да свайго жыцця, — тлумачыць **намеснік галоўнага ўрача па памежнай псіхіятрыі Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера г. Мінска, кандыдат медыцынскіх навук Наталля БЕРАЗОЎСКАЯ**. — У любой сітуацыі ёсць выхад і выбар. Нават пры самым драматычным або жорсткім раскладзе існуе магчымасць манеўру. Вазьміце на ўзбраенне некалькі нескладаных правілаў.

● Стаўце мэты, суразмерныя вашым магчымасцям.

● Вучыцеся адрозніваць галоўнае ад другаснага. Нярэдка ў пагоні за выпадковымі мэтамі праходзіць усё жыццё.

● Разумейце межы сваіх магчымасцяў і кампетэнтнасці. Майце на ўвазе, што нам непадуладныя пол і ўзрост, надвор'е, краіна пражывання, законы, падаткоая сістэма, узровень цэн, курс долара, спажывецкая здольнасць насельніцтва, заторы на дарозе, звычкі і характар іншых людзей. Усё гэта можна толькі прыняць. Стрэс можа абумовіць наша інтэрпрэтацыя, неспакойныя думкі аб малаверагодных падзеях (а раптам?). Непасрэдна ўплываць мы можам на ўзаемадзеянне з партнёрамі і канкурэнтамі, уласныя няправільныя дзеянні, адсутнасць навыку пастаноўкі мэты.

● Развівайце здольнасць бачыць праблему з розных бакоў.

● Можаце настройваць сябе на любыя нечаканасці. Так будзеце пазбаўляцца ілюзій.

Сачыце за рэальным ходам падзей, а не за тым, што адбываецца ў вашай галаве.

● Расцэньвайце любы досвед як станоўчы.

● Калі вы начальнік, значыць, павінны ўмець размеркаваць цяжар адказнасці паміж супрацоўнікамі. Мудра паступае той кіраўнік, які пакідае сабе прыярытэтныя пытанні.

● Арганізуйце свой час.

● Пераключайце ўвагу, мяняйце абстаноўку. Лепей тры-чатыры адпачынкі цягам года, чым адзін месяц, праведзены на курорце.

● Жывіце поўным жыццём — спрабуйце штосьці, што дапамагае адчуваць жыццё ва ўсёй разнастайнасці і прыгажосці.

● Але гэта яшчэ не ўсё. Сёе-тое неабходна зрабіць і для мабілізацыі нашых фізіялагічных магчымасцяў. Піце дастатковую колькасць вады (да васьмі шклянак у дзень), сачыце за харчаваннем, рэгулярна рабіце дыхальную гімнастыку і фізічныя практыкаванні. Засвойце таксама, што самым магутным сродкам у гэтым процістаянні з'яўляецца свядомасць чалавека. З ёю і папрацуем.

Рэлаксацыя. Ад лац. relaxatio — змяншэнне напружання, расслабленне. Гэта курс сістэматычных трэніровак па расслабленні розных груп мышц. Максімальныя скарачэнні чаргуюцца з хуткім расслабленнем пэўнага ўчастка цела. Мяркуецца, што стрэс і трывожнасць звязаны з мышачным напружаннем. Аслабленне напружання мышц дапамагае зменшыць перажыванні. Рэлаксацыі трэба вучыцца, гэтае ўменне дасягаецца толькі пастаяннай практыкай. Звычайна патрабуецца некалькі месяцаў няспынных заняткаў, не менш як паўгадзіны штодня, каб навучыцца дасягаць поўнай рэлаксацыі арганізма. Аднак авалодаць гэтым мастацтвам — значыць авалодаць тым, што прызнае і культурны вопыт многіх народаў, і сучасная навука.

Аўтагенная трэніроўка. Свядомае ўнушэнне пачуццяў цеплыні, цяжару, палёгкі. Аўтатрэнінг наогул распрацаваў нямецкі псіхіятр, які перапрацаваў тыбецкія і індыйскія вучэнні.

Візуалізацыя. Стварэнне ў думках прыгожага пейзажу і сваіх адчуванняў падчас знаходжання там. Гэта можа быць і ўспамін аб падарожжы, адпачынку на прыродзе. Важным тут будзе максімальнае засяроджванне на дэталях — гуках, вобразах, пахах. Такім чынам мы звяртаемся да ўласных рэсурсаў, сіл, для руху далей.

Медытацыя. Гэта паглыбленне ў сябе для дасягнення пачуцця гармоніі. Эмацыянальныя крайнасці выдаляюцца, знешнія аб'екты і ўнутраныя перажыванні адсоўваюцца на другі план, цела расслабляецца. Паводле старажытнай традыцыі многіх культур, гэта стан унутранай цішыні, глыбокі спакой і ясны розум.

Сярод асноўных тэхнік медытацыі варта вылучыць...

...канцэнтрацыю на нейкіх словах. Ва ўсходняй традыцыі прымяняюцца асаблівыя малітвы, мантры. Яны паўтараюцца павольна, шмат разоў, з пэўным рытмам і напевам. Найбольш вядомая мантра — «ом». Некаторыя паўтараюць «мір», «любоў» і г.д.

...расслабленне, рытмічнае дыханне. Дыханне запавольваецца і паглыбляецца, што фізічна спрыяе рэлаксацыі.

...дасягненне стану поўнага адчужэння. Вы сочыце за тым, як узнікаюць, змяняюцца думкі, і не атаясамліваеце сябе з імі. Тэхніка гэта самая складаная, патрабуе гадоў трэніровак.

У востры стрэсавай сітуацыі не варта прымаць ніякіх адказных рашэнняў (калі толькі размова не ідзе пра стыхійнае бедства і ратаванне жыцця). Жаданне штосьці змяніць можа быць надта моцным: «Што мне з гэтым рабіць? Трэба тэрмінова штосьці рабіць!», аднак што сапраўды трэба, дык гэта... павольна (!) палічыць да дзесяці. Ёсць і іншыя простыя спосабы зняць моцнае напружанне.

1. Павольна зрабіце глыбокі ўдых і крыху затрымайце дыханне. Выдых павінен быць паступовым, таксама праз нос.

2. Калі ёсць такая патрэба, папрасіце прабачэння і проста выйдзіце з памяшкання.

3. Намачыце лоб, скроні і артэрыі на руках халоднай вадой.

4. Павольна паглядзіце па баках — проста пераводзьце позірк з аднаго прадмета на другі і апісвайце іх знешні выгляд у думках.

5. Паглядзіце праз акно на неба. Засяродзьцеся на тым, што бачыце. Доўга глядзіце на аблокі, напрыклад.

6. Вельмі павольна выпіце шклянку вады, засяроджваючыся на кожным глытку.

7. Выпрастайцеся, пастаўце ногі на шырыні плячэй і на выдыху нахіліцеся, расслабляючы шыю і плечы так, каб галава і рукі свабодна звісалі долу. Дыхайце глыбока. Рабіце гэта 1-2 хвіліны. Не перастарайцеся, каб не закружылася галава ■

Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

■ Партнёрства

АЛІМПІЯДА ДЛЯ ВАЙСКОЎЦАЎ

У камандным заліку на Армейскіх міжнародных гульнях 2016 года беларускія ваеннаслужачыя занялі чацвёртае месца, абагнаўшы прадстаўнікоў 15 армій свету

Вось ужо другі год запар вайскоўцы з розных краін — са зброяй у руках і на грознай баявой тэхніцы — сустракаюцца на адной тэрыторыі. Як сябры. Дэманструючы, што ўзброены чалавек, а тым больш прадстаўнік дзяржавы, прызначаны выключна для мірнай мэты — абараняць сваю Айчыну.

У першай палове жніўня «Армейскія міжнародныя гульні — 2016» аб'ядналі вайскоўцаў з 19 краін, якія прадэманстравалі магчымасці сваіх нацыянальных армій. Эпіцэнтрам відовішчнага дзейства сталі палігоны краіны-арганізатара — Расійскай Федэрацыі. Упершыню спаборніцтвы прайшлі на тэрыторыі дзвюх дзяржаў: барацьба ў конкурсах «Снайперскі рубеж» і «Майстры артылерыйскага агню» разгарнулася і на адным з палігонаў Рэспублікі Казахстан.

Ідэя праводзіць падобныя спаборніцтвы сярод вайскоўцаў належыць міністру абароны Расійскай Федэрацыі Сяргею Шайгу. А пачалося ўсё з «Танкавага біятлону». У 2013 годзе ў танкавым майстэрстве спаборнічалі чатыры краіны, сёлета ўжо 17. Мерапрыемства выклікала рэзананс у грамадскасці, і было прынята рашэнне на наступны год пашырыць праграму спаборніцтваў. У межах конкурсу «Авіядартс» пачалі змагацца лётныя экіпажы, прадстаўнікі іншых воінскіх падраздзяленняў. У выніку ідэя ўвасобілася ў міжнародныя гульні, якія перараслі ў алімпіяду для вайскоўцаў.

Беларускія ваеннаслужачыя каторы год не ўпускаюць магчымасці паказаць узровень сваёй прафесійнай падрыхтоўкі, майстэрства і зладжанасці экіпажаў. І кожны раз дэманструюць добрыя вынікі. Нягледзячы на тое, што сёлета ім зусім крыху не хапіла, каб увайсці ў тройку лідараў, яны не засталіся «за бортам». Саступіць дзвюм наймацнейшым арміям свету — Расіі і Кітая, а таксама Казахстану, прадстаўнікі якога ўдзельнічалі практычна ва ўсіх конкурсных выпрабаваннях, — пройгрышам назваць складана. У выніковым рэйтынгу за беларусамі — прадстаўнікі 15 армій свету.

— Вайскоўцы з Беларусі ўдзельнічалі ў конкурсах, прымальных для нашых Узброеных Сіл, — расказвае **начальнік 2-га ўпраўлення Галоўнага ўпраўлення баявой падрыхтоўкі Узброеных Сіл Беларусі, намеснік кіраўніка дэлегацыі беларускай каманды на сёлетніх Армейскіх міжнародных гульнях палкоўнік Аляксей ТРАГУБ.** — Прымаць удзел у конкурсе марской пяхоты, якой у нас няма, напэўна, не зусім правільна. Або ў конкурсе «Глыбіня», дзе спаборнічаюць марскія вадалазы. Але ёсць іншыя конкурсы, у якіх мы можам пазмагацца. Таму ў перспектыве плануем павялічыць колькасць спаборніцтваў, у якіх вайскоўцы змогуць прадэманстраваць сваё майстэрства і параўнаць магчымасці з іншымі. Армейскія гульні — цудоўны шанц ацаніць узровень сваёй падрыхтоўкі на фоне іншых.

І трэба адзначыць, што ён, па ацэнках спецыялістаў, у нашых вайскоўцаў на належным узроўні. З васьмі конкурсаў, у якіх прымалі ўдзел беларусы, шэсць разоў яны падымаліся на п'едэстал. Лётныя экіпажы ў конкурсе «Авіядартс» змаглі абагнаць толькі расійскія лётчыкі. Другімі нашы вайскоўцы сталі і ў спаборніцтве баявых разлікаў зенітных ракетных войскаў «Ключы ад неба». Бронзавымі прызёрамі беларусы былі ў конкурсах зенітна-ракетных падраздзяленняў «Чыстае неба», снайперскіх пар «Снайперскі рубеж», ваенных інжынераў «Бяспечны маршрут», ваенных кінолагаў «Верны сябар». Каб трапіць у тройку лідараў, зусім крыху не хапіла нашым дэсантнікам і танкістам. Але калі ў конкурсе «Дэсантны ўзвод» мы сталі чацвёртымі сярод сямі камандаў, то ў «Танкавым біятлоне» чацвёртымі сярод сямнаццаці.

Фота Аляксандра ІВАНОВА.

Па ўмовах гульняў, нацыянальным камандам дазваляецца праходзіць выпрабаванні на сваёй ваеннай тэхніцы. Такім правам скарысталіся і беларускія вайскоўцы. З аднаго боку, гэта з'яўляецца дэманстрацыяй тэхнічных магчымасцяў канкрэтнай арміі. З другога, на сваёй тэхніцы ў каманды ўзрастае шанс паказаць лепшыя вынікі.

Вядома, перад тым як выступіць на міжнароднай арэне, вайскоўцы скрупулёзна трэніруюцца ў сябе на радзіме. Але перш чым трапіць у нацыянальную каманду, трэба прайсці конкурснае выпрабаванне ўнутры свайго воінскага злучэння, на ўзроўні камандавання, і толькі потым на рэспубліканскім. Такі падыход дазваляе адабраць найлепшых спецыялістаў, якія могуць прадэманстраваць добры ўзровень падрыхтоўкі.

Як адзначыў Аляксей Трагуб, у гэтых спаборніцтвах змагаюцца не спартсмены-прафесіяналы, а ваеннаслужачыя, якія па сваім штатным прызначэнні выконваюць абавязкі на гэтым узбраенні або тэхніцы. «Некаторыя краіны з году ў год возяць на армейскія гульні адных і тых жа спецыялістаў, якія ўжо паказалі сябе з лепшага боку, — расказвае прадстаўнік Міністэрства абароны. — Вядома, гэта спрашчае падрыхтоўку вайскоўцаў, якія ўжо адаптаваны да ўмоў, створаных на спаборніцтвах. У нас трохі іншы падыход. На спаборніцтвы едуць толькі самыя лепшыя ваеннаслужачыя, сярод якіх нямала і вайскоўцаў тэрміновай службы. Трэба сказаць, што яны выдатна прадстаўляюць Беларусь на спаборніцтвах, многія краіны нам падобраму зайздросцяць, калі бачаць іх падрыхтоўку».

І пра гэта не дадуць схлусіць расійскія газеты, якія не аднойчы падчас гульняў рабілі рэверансы ў бок беларускай каманды. Тая ж «Красная звезда» не ўпускала магчымасці пахваліць беларускіх вайскоўцаў. Прычым заслужана. Напрыклад, нягледзячы на тое, што ў конкурсе «Чыстае неба» ў лідарах былі расійскія разлікі, механік-кіроўца баявога разліку беларускай арміі быў найлепшым пры кіраванні шматвосевымі машынамі, за што яго адзначылі ў спецыяльнай намінацыі. І сярод снайпераў у індывідуальным спаборніцтве роўных беларускаму стралку не было: ён заняў першае месца ў асабістым заліку, апярэдзіўшы 72 удзельнікаў з іншых краін.

Геаграфія і фармат Армейскіх міжнародных гульняў з кожным годам пашыраюцца і ўдасканальваюцца. Калі летась на 11 палігонах было праведзена 13 конкурсаў па палявой, паветранай і марской вывучцы вайскоўцаў, то сёлета яны спаборнічалі на 20 палігонах: ад Севастопаля да Махачкалы, ад Калінінграда да Новасібірска. Ды і конкурсных спаборніцтваў стала амаль удвая больш.

Як кажуць удзельнікі гульняў, гэтае мерапрыемства дае магчымасць не толькі паназіраць за ўзроўнем падрыхтоўкі ў арміях іншых краін, але і набыць сабе сяброў. Нават нягледзячы на пэўны моўны бар'ер, падчас гульняў і паза імі (у вольны час ладзіліся цікавыя экскурсіі), яднае народы. Здавалася б, дзе тая Індыя. Тым не менш вайскоўцы з гэтай краіны вельмі суперажывалі беларусам на спаборніцтвах, дапамагалі і нават дзяліліся пэўнымі тэхнічнымі хітрасцямі.

— Гэтыя гульні ў тым ліку накіраваны на тое, каб звычайныя людзі (а яны былі жывымі сведкамі многіх спаборніцтваў. — **Аўт.**) больш даведаліся пра армію і разумелі, для чаго яна прызначана, — лічыць Аляксей Трагуб. — Упэўнены, што ў большасці з іх з'яўляецца пачуццё гонару за сваю краіну. Асабліва — калі на міжнароднай пляцоўцы сваё майстэрства дэманструюць сыны, мужы, браты.

Мяркуецца, што ў будучыні Армейскія міжнародныя гульні афіцыйна набудуць статус ваеннай алімпіяды. Хоць, па сутнасці, яны такімі і з'яўляюцца. Але не гэта галоўнае. Няхай падобныя сустрэчы і надалей адбываюцца не на полі бою, а толькі ў межах мірнага спаборніцтва.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

■ Даслоўна

ПАРАД АРКЕСТРАЎ,

або «Полька беларуская» на Краснай плошчы

Ужо каторы год запар напрыканцы лета — у пачатку восені на галоўнай плошчы Масквы ладзяць міжнародны ваенна-музычны фестываль «Спаская вежа». Каб паназіраць за сапраўдным шоу, якое традыцыйна рыхтуюць вайсковыя музыкі з розных краін свету, на змярканні каля Крамля збіраецца некалькі тысяч гледачоў.

Узорна-паказальны аркестр Узброеных Сіл Беларусі перад такой публікай выступае не ўпершыню. Кожны год музыканты ў пагонах рыхтуюць новую ўнікальную праграму. Сёлета гледачы фестывалю былі ў захапленні ад «Полькі беларускай» у выкананні нашых вайскоўцаў. Аркестранты нават прытанцоўвалі, і гэта было ацэнена найвышэйшай для артыстаў узнагародай — громам апладысментаў. Пад авацыі і, безумоўна, музычнае суправаджэнне ваеннага аркестра выступіла і рота ганаровай варты.

Як адзначыў **начальнік ваенна-аркестровай службы Узброеных Сіл — начальнік Узорна-паказальнага аркестра Узброеных Сіл, заслужаны артыст Беларусі палкоўнік Сяргей КАСЦЮЧЭНКА,** з якім мы сустрэліся па прыездзе калектыву ў Мінск, тэмп выканання нашай роты ганаровай варты дынамічны, ён адрозніваецца ад усіх іншых рот, якія выступалі падчас фестывалю. Дарэчы, перад гледачамі сваё майстэрства прадэманстравалі роты з Казахстана і Манголіі, 154-ы асобны камендацкі Праабражэнскі полк Расіі, рота спецыяльнай варты Прэзідэнцкага палка Расійскай Федэрацыі. Усяго ў фестывалі «Спаская вежа» сёлета ўдзельнічалі 20 калектываў з 12 краін. Свет не ведае іншага фестывалю, які больш як тыдзень ладзіўся б на адной пляцоўцы.

— Сяргей Мікалаевіч, не можа не радаваць той факт, што ў фестывальным рэпертуары аркестра — беларускія нацыянальныя творы. Такім чынам вы папулярызуеце айчынную культуру...

— Уся музыка, якую мы выконвалі падчас фестывалю, была наша: беларуская народная, сучасных беларускіх кампазітараў. У прыватнасці, кампазітара Леаніда Шырына. Увогуле, на які б мы фестываль не ехалі, звяртаемся да нашай творчасці. Так, мы можам выканаць дватры творы як падарунак для гледача той краіны, дзе выступаем. Ды і навошта нам выконваць англійскую або амерыканскую музыку, калі туды прыязджаюць нацыянальныя аркестры, лепш за якія гэтага ніхто не зробіць? Тое ж самае і з беларускай музыкай. Мы ведаем, як яна павінна гучаць, яна ў нас у крыві. Іншаземцы будуць выконваць яе па-іншаму. Падобныя фестывалі таксама карысныя тым, што ў нас, музыкантаў, ёсць магчымасць паглядзець на ўзровень іншых аркестраў, абмяняцца вопытам, паназіраць за тым, куды вядуць кірункі музыкі ў духавой творчасці.

— Кожны фестываль «Спаская вежа» адрозніваецца сваёй тэматыкай. Які лейтматыў быў вызначаны сёлета?

— Сапраўды, звычайна фестываль мае тэматыку. Летась, напрыклад, ён быў прысвечаны 70-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Сёлета пэўнай тэматыкі фестывалю не існавала. Агульным пажаданнем у арганізатараў было пасвавольнічаць. Мы, вядома, не свавольнічалі, бо гэта таксама трэба рабіць у меру, хоць жарты мы любім, што пацвярджаем амаль кожны наш канцэрт.

— Як удаецца быць «на адной ноце» з ротай ганаровай варты? У адрозненне ад артыстаў аркестра, вайскоўцы, за рэдкім выключэннем, без музычнай адукацыі...

— Розныя юнакі служаць у роце. Тое, што ў большасці з іх няма прафесійнай адукацыі, не сведчыць пра тое, што яны не разбіраюцца ў музыцы. Многія хлопцы спяваюць пад гітару, нехта вучыўся ў музычнай школе. У большасці з іх ёсць слых. Прычым у дадзеным выпадку ён патрэбен не музычны, а рытмічны.

— Вы не шукаеце лёгкіх шляхоў. Шыкоўную праграму пад акампанемент аркестра выканала рота на парадзе ў Дзень Незалежнасці. Думаю, такое выступленне прыйшлося б даспадобы і гледачам у Маскве...

— Мы даўно ведалі, што паедзем на «Спаскую вежу». Але для выступлення на парадзе войск Мінскага гарнізона планавалася прынцыпова іншая праграма. Рота хацела выступіць пад музыку з «Піратаў Карыбскага мора», і мы ажыццявілі іх задуму. Паколькі да дасканаласці трэба было давесці парадную праграму, яны не маглі вучыць фестывальнае выступленне. Тым больш на парад рыхтавалася зводная рота, а ў Маскву паехаў узвод. Да «Спаскай вежы» аркестр таксама ўдзельнічаў у мерапрыемствах. Сярод буйных — пляц-канцэрт аркестраў, які падчас «Славянскага базару» адбыўся на плошчы Перамогі ў Віцебску. Нягледзячы на ўсю гэтую загружанасць, нам удалося дасканала вывучыць фестывальную праграму і парадаваць гледачоў на «Спаскай вежы».

— Здаецца, ваша прафесія — заўжды свята. А ці ёсць будні ў музыкаў у пагонах?

— Многія думаюць, што мы толькі канцэрты ладзім, але ніхто не адмяняў сустрэчы афіцыйных дэлегацый, парады, рэпетыцыі, працу над абнаўленнем рэпертуару. Часта пытаюць, а што ў вас будзе новае? У нас такі прынцып: кожны год — новая праграма. Ды і на адной пляцоўцы мы ніколі не паўторым адзін і той жа канцэрт. І на вучэнні ездзім, і ў аддаленых вайсковых часцях выступаем. Няхай там служыць дзясятак-два людзей, але яны не павінны быць абдзелены ўвагай тых, хто сапраўды любіць музыку.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

Выступленне беларускіх вайскоўцаў на IX міжнародным ваенна-музычным фестывалі «Спаская вежа» прапануем паглядзець на сайце «Звязды».

ПЛАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 9 (60)

■ Факт

БРЫГАДА ЗНОЎ ПАВЕТРАНА-ДЭСАНТНАЯ!

103-ю мабільную брыгаду, якая дыслацыруецца ў Віцебску, перайменавалі ў паветрана-дэсантную. Гэтая навіна стала прыемным падарункам для «крылатай пяхоты» ў Дзень дэсантніка. Адпаведнае рашэнне прыняў міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ.

— Змена назвы зроблена ў мэтах захавання пераемнасці пакаленняў, павышэння матывацыі ваеннаслужачых і гонару за прыналежнасць да падраздзялення, якія маюць слаўныя баявыя традыцыі. Вяртанне гвардзейскім злучэнням гістарычных найменняў паслужыць дадатковым стымулам для воінаў брыгад ва ўдасканаленні баявога майстэрства, умацаванні абараназдольнасці нашай краіны, — растлумачылі ў міністэрстве.

І, вядома, салдатам, сяржантам, прапаршчыкам і афіцэрам 103-й асобнай гвардзейскай ордэна Леніна, Чырванасцяжнай, ордэна Кутузава II ступені паветрана-дэсантнай брыгадзе імя 60-годдзя СССР ёсць чым ганарыцца. Напрыклад, падчас аказання інтэрнацыянальнай дапамогі ў Афганістане 11 тысяч чалавек былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. 8 чалавек былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. Большасць, на жаль, — пасмяротна...

Міністр абароны, які падчас святкавання Дня паветрана-дэсантных войскаў назваў абласны цэнтр «дэсантнай сталіцай», падкрэсліў, што беларускія воіны змогуць годна абараніць такую прыгожую краіну. І вялікая надзея на дэсантнікаў, якія ўжо шмат разоў даказвалі свой высокі прафесіяналізм.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

■ Векапомнае

МАЛАДОСЦЬ, АПАЛЕНАЯ ВАЙНОЙ

Наш падпісчык, ветэран Вялікай Айчыннай, у дэталях памятае сваё ваеннае мінулае

Вячаслаў Іванавіч і Філямена Канстанцінаўна Буйкі жывуць разам у вёсцы Паняначы Шаркаўшчынскага раёна ўжо звыш 60 гадоў. Самі некалі пабудавалі дом. Будоўля ішла доўга: не хапала сродкаў, ды і спяшацца не было чаго. Жылі яны непадалёку на хутары ў вялікай дружнай сям'і з бацькамі жонкі. І цяпер Буйкі, можна лічыць, як хутаране: у іх вёсцы засталіся толькі дзве сям'і.

Філямена Канстанцінаўна — мая хросная маці. Кажуць, што на такую пачэсную місію бацькі дзіцяці, якога хрысцяць, выбіраюць намнога маладзейшых за сябе асоб, каб пасля таго, як яны адыдуць у іншы свет, было каму прадаўжаць выхоўваць дзіця. Мае бацькі ўжо адышлі, і я вельмі хачу, каб мае хросныя жылі як мага даўжэй.

8 кастрычніка ветэрану Вялікай Айчыннай вайны і працы Вячаславу Іванавічу Буйку спаўняецца 91 год. Гэта адзіны мой зямляк-ветэран, які дажыў да такога ўзросту. Гісторыю яго жыцця ведаю даволі падрабязна, але напярэдадні свята завітала ў вёску, каб пабачыцца і распытаць пра мінулае і сучаснае жыццё.

На падворку засталіся толькі куры: іншую жыўнасць не ў стане трымаць. Апрацоўваюць невялікі агародзік, маюць садавіну. Зайшла ў хату, дзе чыста і акуратна, усе рэчы на сваіх месцах. Тут пастукала ў дзверы мясцовая паштальёнка:

— Іванавіч, што будзем выпісваць? — звярнулася жанчына да гаспадара.

— Ці ты, Ніна, не ведаеш? — адказаў той. — Мая любімая газета — «Звязда», пастаянна чытаем, будзем і на гэты раз. Люблю яе, можа, таму, што карэспандэнты пішуць на нашай мове — цікава і змястоўна.

Пайшла паштальёнка, і я звярнулася да ветэрана, каб яшчэ раз успомніў гады сваёй ваеннай маладосці. Вячаслаў Іванавіч пайшоў у другі пакой і дастаў з шафы геаграфічную карту СССР, якая захоўваецца там якраз на такі выпадак. Каб было больш зразумела, стаў вадзіць указкай па знаёмых мясцінах і расказваць пра ваенныя дзеянні:

— ...Віцебшчына адносілася да так званай вобласці армейскага тылу нямецка-фашысцкай групы армій «Цэнтр». Разам са сваімі аднагодкамі я дапамагаў партызанам: адвозілі ў лес прадукты і адзенне, што давалі бацькі.

У сям'і нас было тры браты: Аляксандр, Аркадзь і я. Аб'яўлены быў набор на службу ў армію. Бацькі сабралі нам заплечнікі: хлеб, сала, сушаную садавіну. На кані бацька адвёз усіх трох на зборны пункт у вёску Бяльмонты (цяпер Браслаўскага раёна). Адтуль сфарміраваны атрад рушыў пешшу ў Шаркаўшчыну ў ваенкамат, потым нас адправілі, зноў жа пехатою, на захад. Ішлі тры дні. Здаралася, і па бездарожжы, і ляснымі дарогамі да чыгуначнай станцыі Краснае, што непадалёку ад Маладзечна. Салдаты запоўнілі тры вагоны таварнага цягніка. Праз Мінск накіраваліся ў Смаленск. Змучаных ад доўгай дарогі, нас вырашылі прывесці ў належны выгляд. Адправілі на Дняпро памыцца, а тым часам адзенне дэзынфіцыравалі ў спецыяльнай аўтамашыне. Далейшы шлях быў на Маскву. Там на 10 дзён далі сухія пайкі і чыгункай адправілі на Карэльскі фронт.

У Архангельскай вобласці, на ўзбярэжжы Белага мора, нас расфарміравалі па вайсковых часцях. Мы з братамі трапілі ў 31-ы полк 25-й стралковай дывізіі, які стаяў у абароне на Анежскім возеры. Тут вайна яшчэ працягвалася. Нямецка-фашысцкія войскі трымалі лінію абароны ад Ленінграда і далей на поўнач. Савецкі полк стаяў у абароне і не даваў фашыстам адступаць. Наш узвод супрацьтанкавай роты адышоў далёка на поўнач да фінскай мяжы. Была глыбокая восень. Вельмі холадна, мы не прывыклі да такога суровага клімату. Выручала маладосць і вынослівасць.

Пасля зняцця блакады Ленінграда нас параходам па Белым моры даставілі на самы паўночна-заходні на Кольскім паўвостраве горад Печанга. Фашысты баяліся, каб мы не пазбавілі іх магчымасці перадыслацыравацца на захад. Таму імкнуліся вывесці свае фарміраванні ў нарвежскі порт Керкінес. Некаторыя салдаты з варожых груп не вытрымлівалі такога націску і пераходзілі на наш бок.

...Перамогу мы сустрэлі на нарвежскай мяжы. Добра памятаю той дзень, калі ў чатыры гадзіны ночы паднялі ўсіх па трывозе. Аб'явілі, што і сюды прыйшла перамога. Значыць, быў шлях дадому. Салдаты цягніком даехалі да Полацка, адтуль — у Глыбокае. У Шаркаўшчыну я дабраўся на аўтамашыне, якая прывозіла збожжа на прыёмны пункт. Да свайго хутара ішлі пешшу. Бацьку ў жывых не засталі...

Кожны з нас будаваў сваё ўласнае гняздо. Я ўладкаваўся ў калгас «За сумленную працу» рахункаводам. Там працавала і Філямена. Мы сябравалі. Скончыў курсы ў Полацкай школе бухгалтараў і пэўны час працаваў галоўным бухгалтарам у калгасе ўжо пад назвай імя Кірава. Ішоў час, на змену прыйшлі маладыя, больш адукаваныя спецыялісты, і я пайшоў працаваць брыгадзірам комплекснай брыгады. Амаль у 50 гадоў атрымаў пасведчанне трактарыста-машыніста і пэўны час працаваў на гусенічным трактары».

З Філяменай Канстанцінаўнай яны стварылі трывалую сям'ю. Выхавалі дваіх сыноў. Дзеці часта прыязджаюць у госці. І дзякуй Богу, што бацькі сустракаюць іх яшчэ на сваіх нагах!

Кацярына СОСНА

■ Баявая падрыхтоўка

Трымаць руку на пульсе

Ва Узброеных Сілах Беларусі завяршылася камандна-штабное вучэнне. На працягу тыдня органы кіравання Узброеных Сіл, іншых войскаў і вайсковых фарміраванняў вучыліся рэагаваць на змену характару і спосабаў вядзення ўзброенага процідборства, а таксама адпавядаць перспектыўным патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ваеннай арганізацыі дзяржавы.

Нагадаем, у мерапрыемстве былі задзейнічаны органы кіравання, вайсковыя часці і падраздзяленні Узброеных Сіл, аператыўныя групы і падраздзяленні міністэрстваў унутраных спраў і па надзвычайных сітуацыях, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, а таксама аператыўныя групы Камітэта дзяржаўнай бяспекі і Следчага камітэта Беларусі — усяго каля 7,5 тысячы чалавек.

На першым этапе вучэння органы кіравання Узброеных Сіл атрымалі вопыт міжведамаснага ўзаемадзеяння і кіравання на этапе стварэння групоўкі Узброеных Сіл, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў у інтарэсах правядзення спецыяльнай аперацыі. Практычна былі адпрацаваны пытанні ўзмацнення дзяржаўнай мяжы, пошуку і знішчэння дыверсійна-разведвальных груп праціўніка, дэблакіравання аэрадрома, захопленага незаконным узброеным фарміраваннем. На другім этапе былі выкананы задачы па ахове і абароне важных аб'ектаў, спыненні спроб парушэння дзяржаўнай мяжы на сушы і ў паветры, ліквідацыі наступстваў аварый тэхнагеннага характару на прамысловых прадпрыемствах і транспарце, выяўленні і знішчэнні лагераў падрыхтоўкі баевікоў і іншыя.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

5 октября 2016 года в 15.30 в малом зале Гомельского районного исполнительного комитета, расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 51а, СОСТОИТСЯ АУКЦИОН НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА, РАСПОЛОЖЕННОГО НА ТЕРРИТОРИИ УЛУКОВСКОГО СЕЛЬСОВЕТА

№ лота	Кадастровый номер и адрес земельного участка, его размеры, целевое назначение, назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества	Срок аренды (лет)	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений	Начальная цена предмета аукциона	Затраты на организацию и проведение аукциона в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, подлежащие возмещению победителем аукциона	Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета
1	321089206601000484 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) площадью 0,1245 га. Гомельская область, Гомельский район, Улуковский с/с, д. Романовичи, ул. Школьная, участок №7 Имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земельный участок расположен в охранной зоне сетей и сооружений канализации, площадь – 0,0249 га	99	Имеется возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, канализации, газоснабжению. Дорога в асфальтном исполнении	13 523 р. 15 коп. (135 231 500 рублей)	Расходы в сумме 9 286 руб. 60 коп. (9 286 000 рублей) и расходы, связанные с опубликованием объявления	Задаток в сумме 1 352 руб. 32 коп. (13 523 200 рублей) на р/с 3641414220021 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, получатель – Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002

Заявления об участии в аукционе и прилагаемые к ним документы принимаются по адресу: Гомельский район, агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а, каб. 6, с даты опубликования по 03.10.2016 с 8.00 до 17.00, обед – 13.00–14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Условия участия в аукционе.

Аукцион проводится при наличии не менее двух участников.

Для участия в аукционе гражданин (лично либо через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с Улуковским сельским исполнительным комитетом соглашение установленной формы.

Кроме того, в комиссию представляются:

- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

- представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона, а также заключившие соглашение.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

После получения необходимых документов от гражданина на участие в аукционе комиссия выдает ему билет участника аукциона с указанием даты регистрации заявления и номера, под которым он будет участвовать в аукционе. Данные о каждом участнике аукциона заносятся в книгу регистрации участников аукциона.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. Неявка участника аукциона на аукцион приравнивается к письменному отзыву заявления об участии в нем. При этом участнику аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возвращается сумма внесенного им задатка (задатков).

Письменный отзыв заявления или неявка участника аукциона на аукцион регистрируется в книге регистрации участников аукциона.

Прием заявлений об участии в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленный комиссией или организацией день и час, но не ранее чем за 3 рабочих дня до даты проведения аукциона. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в комиссии или организации.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Перед началом аукциона его участники обязаны зарегистрироваться в комиссии и обменять билеты участников аукциона на аукционные номера, которые возвращаются в комиссию после окончания аукциона.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

1. в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:

1.1. внести плату за право заключения договора аренды земельного участка;

1.2. возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка;

2. заключить с сельисполкомом договор аренды земельного участка и в течение двух месяцев со дня его подписания, но не позднее трех месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона обратиться в Гомельский межгородской филиал республиканского унитарного предприятия «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него (г. Гомель, ул. Войкова, 87);

3. выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в аренду победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Участникам предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с членами комиссии (по предварительному согласованию).

Справки по адресу: Гомельский район, агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а, тел. 936-275, 937-290.

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**Частное предприятие «МАВ-Недвижимость», г. Минск, ул. Короля, д. 6, комн. 1**

Предмет аукциона

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес
Лот №1			
Здание пристройки (здание многофункциональное)	111,1 кв.м	630/С-68316	Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Язепа Дроздовича, 1/2
Составные части и принадлежности: открытый навес			
Обременения	Здание сдано в аренду (срок действия до 31.12.2016)		
Начальная цена без НДС – 58 800 долларов США			
Лот №2			
Изолированное помещение №2 (торговое помещение)	457,4 кв.м	630/D-41119	Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Язепа Дроздовича, 1-98
Начальная цена без НДС – 148 200 долларов США			

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010, в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после согласования проекта договора купли-продажи с залогодержателем в связи с наличием обременения в пользу ЗАО «МТБанк» (ипотека)

Условия оплаты предмета аукциона

Оплата за предмет аукциона производится резидентами РБ в белорусских рублях по курсу Нацбанка РБ на дату платежа; нерезидентами РБ – в белорусских рублях либо в иностранной валюте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Аукцион состоится 25.10.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 24.10.2016 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-183-69-71. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

---

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2016 г.

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2016 год	2015 год
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	2 429 109	3 273 983
